КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 37 (260) ◂ 7 кастрычніка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ЗАГАДКА ПАЛІКОТА**

Стар. 11

**ЕГУ РЫХТУЕ КАДРЫ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ Ў ГЭТЫМ СВЕЦЕ**

На найбольш частыя крытычныя пытанні, якуя гучаць на адрас ЕГУ, адказвае прарэктар па акадэмічных пытаннях прафесар Аляксандр Калбаска ў размове з журналісткай «НЧ» Вольгай Хвоін

Стар. 6

**ПУЦІНСКІ ЗАСТОЙ**

Вяртанне Пуціна ў якасці прэзідэнта адбываецца на фоне праслаўлення Брэжнева — савецкага рэкардсмена па тэрміну знаходжання на пасадзе кіраўніка дзяржавы

Стар. 12

**ПРЫГОДЫ ПОСТМАДЭРНІЗМУ**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЛЕАНІД ЗАІКА**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ **З НАГОДЫ**

# ЖЫЦЦЁ НЕ ПА СРОДКАХ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**На мінулым тыдні ў рознічным гандлі былі заўважаны кілбасы коштам больш за 100 тысяч рублёў за кілаграм. Далей няма куды? Не.**




Каб адказаць на пытанне «чаму», трэба разгледзець структуру эканомікі аграпрамысловага комплексу. Як вядома, яе склад фарміруюць непасрэдныя вытворцы сельскагаспадарчай сыравіны і перапрацоўчыя прадпрыемствы. Прадукцыяй апошніх з'яўляюцца гатовыя да ўжывання харчовыя прадукты або паўфабрыкаты. Для іх вытворчасці патрабуецца вельмі шмат цеплавой і электрычнай энергіі, таму цалкам зразумела, што дэвальвацыя нацыянальнай грашовай адзінкі рэзка падвысіла сабекошт вытворчасці тых жа кілбас у рублях.

Але і гэта не ўсё. На палях і фермах працуе процьма розных механічных ці электрамеханічных агрэгатаў, дый увогуле выкарыстоўваюцца тэхналогіі, якія нельга назваць энергазберагальнымі. З гэтай нагоды сабекошт вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў нацыянальнай валюце таксама падвысіўся. Ужо ў ліпені індэкс коштаў вытворцаў сельгаспрадукцыі ў раслінаводстве адносна студзеня мінулага года склаў 187%, у тым ліку па зерню і зернебабовым — 230%, па бульбе — 190,5%. Калі ж параўнаць кошты ліпеня бягучага года з ліпенем мінулага, то безумоўным лідарам у цэнавай гонцы з'яўляецца бульба — індэкс коштаў вытворцаў гэтай нацыянальнай культуры склаў 300%.

Паколькі ў спажыванні бульбы, так бы мовіць, на роўных канкуруюць насельніцтва і свіное пагалоўе Рэспублікі Беларусь, то цэнавая дынаміка на бульбу ў значнай ступені вызначае дынаміку коштаў харчовых тавараў. А гэта значыць, што яны маюць вельмі значную перспектыву для далейшага падвышэння. Збіць гэту хвалю можна толькі павялічэннем датацый сельгаспрадпрыемствам. Але ў выпадку з бульбай нават гэтыя прэферэнцыі зрабіць цяжка, бо абсалютную большасць «другога хлеба» вырошчваюць і пастаўляюць на рынак не сельгаскааператывы, а гаспадаркі насельніцтва і фермеры. А ім дзяржава ніколі не забяспечвае прэферэнцый, баючыся канчатковага банкруцтва арганізаванага сектара аграрнай эканомікі.

Дэвальвацыя ўвогуле паставіла перад грамадствам некалькі далікатных пытанняў. Па-першае, аб адказнасці ўлады за штучнае, эканамічна неабгрунтаванае падвышэнне заробкаў і іншых грашовых выплат насельніцтву па працягу перадвыбарнага 2010 года. Было сказана, што беларусы жывуць не па сродках, але не яны друкавалі грошы, якімі ім выплачваліся падвышаныя заробкі. Шараговыя беларусы паверылі ў эканамічную стабільнасць, яны з паразуменнем паставіліся да 20% дэвальвацыі напачатку 2009 года, пагадзіўшыся, што тыя цяжкасці абумоўлены сусветным фінансавым крызісам. Але ж сітуацыя 2010 года была цалкам створана ўладамі. Спачатку грошы выдалі, а потым залезлі ў кішэні і забралі ў кожнага столькі, колькі палічылі мажлівым. Пасля скасавання савецкіх ашчаджэнняў грамадзян (якія, дарэчы, абяцалі ў нейкай ступені кампенсаваць), гэта другое маштабнае рабаванне насельніцтва дзяржавай, якая быццам бы створана народам і дзейнічае ў інтарэсах народа.

З боку народа, дарэчы, ніякіх масавых акцый пратэсту не назіралася, але пратэстныя настроі, хоць і не вельмі акрэсленыя, значна пашырыліся. Людзі амаль перасталі баяцца саміх сябе. Пакуль што. У крамах, у грамадскім транспарце, ва ўстановах сацыяльнага забеспячэння звычайна вельмі эмацыянальна выказваюцца такія вострыя меркаванні, якія раней можна было палічыць правакацыямі. Хоць на самай справе зараз галоўным правакатарам сацыяльнай варожасці ў грамадстве з'яўляецца эканамічная палітыка ўладаў. З улікам вертыкальнай іерархіі можна назваць і імёны галоўных правакатараў.

Патрабуе тлумачэння пытанне, навошта ўсё гэта было зроблена. Калі мэтай было адабраць грошы ў насельніцтва, дык атрымалася вельмі файна. У адзін момант заробкі людзей зрабіліся цалкам «умоўнымі»: можна не памерці з голаду, але нельга нармальна жыць. А камусьці ўвогуле нельга жыць. Згодна дадзеным Белстата, 2,9% занятых мелі ў маі заробак меней за 500 тысяч рублёў. Гэта не так ужо і мала — 135 тысяч чалавек. 27,6% усіх занятых (1,29 мільёна чалавек) мелі заробкі ад 0,5 да 1 мільёна рублёў. А найбольшую ўдзельную вагу сярод занятых (28,7%, або 1,339 мільёна чалавек) мелі заробкі ад 1 да 1,5 мільёна рублёў. Заработная плата гэтай апошняй групы знаходзіцца ў сярэдзіне шэрагу зарплат (іх атрымоўвае самая вялікая частка занятых) і таму яна называецца медыяннай. З гэтай нагоды лічыцца, што медыянная зарплата больш адэкватна характарызуе стан рынка працы, чымсьці сярэдняя, якая вызначаецца простым дзяленнем агульнага фонду заработнай платы на колькасць занятых.

Такім чынам, у маі большая частка занятых (59,2%, або 2,762 мільёна чалавек) мела заробкі да 1,5 мільёна рублёў, што па курсу, які існаваў да 23 мая, не дацягвала да абяцаных 500 долараў. Пасля дэвальвацыі заробкі гэтай групы, калі пералічыць іх па адзінаму рэальнаму тады курсу чорнага рынка, складалі ад 70 да 210 долараў. Калі ўлічыць, што рыса беднасці для краін, якія месцяцца на Поўдні ад Сахары, складае 30 долараў, то матэрыяльнае становішча значнай часткі беларусаў стала цалкам параўнальным з «дабрабытам» бяднейшых краін свету.

Як яно далей пойдзе, пакуль невядома. Ясна, што для стабілізацыі коштаў на спажывецкім рынку заробкі будуць падвышацца. На нейкім этапе (магчыма, што гэта ўжо адбылося) заробкі большасці занятых згубяць сацыяльна-эканамічны змест, бо людзі згубяць усе шансы зарабляць дастаткова на жыццё. Таму трэба забяспечваць іх рост. Пакуль што ўрад і шаноўны спадар прэзідэнт нічога лепшага не прыдумалі, акрамя друкавання пустых паперак. Рэальныя заробкі ўсё яшчэ змяншаюцца, затое кашалькі таўсцеюць.

Да дэвальвацыі гэта рабілася дзеля перамогі на выбарах, зараз — дзеля захавання ўлады.

АБ'ЯДНАННЕ

# СУПРАЦЬ АЭС

**Палітыкі, эколагі і грамадзяне Літвы, Беларусі і Расіі будуць змагацца супраць трох АЭС у Балтыйскім рэгіёне.**

30 верасня ў Вільнюсе прадстаўнікі шэрагу палітычных партый і рухаў, экалагічных, рэлігійных арганізацый, ініцыятыўных груп, а таксама грамадскія дзеячы Літвы, Расіі і Беларусі аб'ядналіся для барацьбы супраць трох АЭС у рамках грамадскай кампаніі «За бяз'ядзерны рэгіён!».

Была прынятая Дэкларацыя міжнароднай грамадскай кампаніі «За бяз'ядзерны рэгіён!», першачарговая мэта якой — «дамагчыся таго, каб Беларусь, Літва і Калінінградская вобласць Расіі ўсталі на бяз'ядзерны шлях развіцця».

У тэксце дэкларацыі адзначаецца, што ўрады трох краін Балтыйскага рэгіёна вырашылі будаваць тры АЭС у непасрэднай блізасці ад межаў іншых дзяржаў на адлегласці, якае не перавышае 350 кіламетраў адна ад адной, у той час, як «зона ўздзеяння кожнай з іх у выпадку цяжкай аварыі можа скласці больш тысячы кіламетраў». У дэкларацыі выяўляецца ўпэўненасць у тым, што Расія, Беларусь і Літва могуць ісці па шляху ўстойлівага бяз'ядзернага развіцця, бо «ў свеце ёсць нямала прыкладаў краін (Нарвегія, Данія, Аўстрыя, Італія), якія дасягнулі высокага ўзроўню дабрабыту сваіх грамадзян і тэхналагічнага развіцця, адмовіўшыся ад ядзернай энергетыкі.

Сярод арганізацый, якія ўжо падпісалі дэкларацыю, — партыя сялян-народнікаў Літвы, рух «Саюдзіс», рух Зялёных Літвы, грамадская арганізацыя Атгайя, ініцыятыўная група з Вільнюса «Супраць трох АЭС!», дэпутат Сойму Казімерас Уока, Канфедэрацыя аб'яднанага дэмакратычнага руху Літвы, беларускае грамадскае аб'яднанне «Экадом», Беларуская антыядзерная кампанія, беларуская група «Пагоня», актывісты Беларускай партыі Свабоды, Беларускай партыі «Зялёныя» і святары аўтакефальнай праваслаўнай царквы Беларусі, грамадская кампанія «Астравецкая атамная — гэта злачынства!», міжнародная група «Экозащита!» (Масква—Калінінград), Экалога-прававаабарончы цэнтр «Беллона», група «Экоперестройка» і грамадская арганізацыя «Сябры Балтыкі» (Санкт-Пецярбург), Ніжагародская антыядзерная кампанія, Антыядзернае грамадства Татарстана, Экацэнтр «Дронт» (Ніжні Ноўгарад), Калінінградскае рэгіянальнае аддзяленне «Іншая Расія», Калінінградскі грамадскі фонд сацыяльнай падтрымкі і праваабароны, а таксама Міжнародны сацыяльны экалагічны саюз.

Удзельнікі кампаніі «За бяз'ядзерны рэгіён!» абвясцілі таксама пра тое, што будуць выкарыстоўваць розныя метады процідзеяння будаўніцтву АЭС, у тым ліку збіраць подпісы супраць трох АЭС, дамагацца правядзення нацыянальных рэферэндумаў, выступаць з заканадаўчымі ініцыятывамі, патрабаваць уліку меркавання грамадзян сваіх і суседніх краін у адпаведнасці з міжнароднымі экалагічнымі канвенцыямі Орхускай і Эспоо. Гэтыя дзеянні будуць адбывацца адначасова ў трох краінах, што дасць магчымасць узмацніць ціск на ўрады і наддзяржаўныя структуры.

Да дэкларацыі працягваюць далучацца грамадскія арганізацыі, ініцыятывы і палітычныя партыі трох краін.

НАРОДНЫ СХОД

# АКТЫВІСТАЎ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ

**Яшчэ амаль за тыдзень да правядзення Народнага сходу дэмакратычных актывістаў у рэгіёнах пачалі затрымліваць, папярэджаваць і адпраўляць на суткі.**

У Брэсце вечарам 3 кастрычніка быў затрыманы намеснік старшыні гарадской арганізацыі Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Лявонцій Чыпурных, які распаўсюджваў інфармацыйныя ўлёткі аб Народным сходзе.

Як паведаміла старшыня гарадской арганізацыі Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Людміла Дзенісенка, 3 кастрычніка прыкладна ў 19.30 ёй патэлефанаваў Чыпурных і праінфармаваў, што яго даставілі ў Маскоўскі РАУС Брэста. «Супрацоўнікі міліцыі затрымалі яго за распаўсюджванне інфармацыі. Ноч актывіст правёў у ізалятары часовага ўтрымання, яго мабільны тэлефон адключаны», — сказала Дзенісенка.

Яна адзначыла, што ў гэты вечар Чыпурных апускаў у паштовыя скрыні жыхароў дамоў у Маскоўскім раёне друкаваныя матэрыялы з інфармацыяй аб Народным сходзе.

4 кастрычніка Лявонцій Чыпурных быў асуджаны на пяць сутак адміністрацыйнага арышту. Суд Маскоўскага раёна Брэста прызнаў Чыпурных вінаватым на падставе ч. 1 арт. 23.34 КоАП (парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавага мерапрыемства ці пікетавання).

У Гомелі 4 кастрычніка затрыманы актывіст зарэгістраванай у Чэхіі маладзёжнай арганізацыі «Малады фронт» Андрэй Цянюта.

Як паведаміў яго знаёмы Дзмітрый Карашкоў, прыкладна ў 11.00 ён сустракаўся з Цянютам каля абласной бібліятэкі на плошчы Перамогі. Да іх падышлі супрацоўнікі АМАП, папрасілі прад'явіць мабільныя тэлефоны. «Яны растлумачылі, што шукаюць украдзеныя мабільныя тэлефоны. Праверыўшы тэлефоны, супрацоўнікі АМАП запатрабавалі прад'явіць да агляду нашы рукзакі. У Андрэя яны знайшлі расцяжку «Свабоду Дашкевічу» і затрымалі яго», — сказаў Карашкоў. Паводле яго слоў, актывіста даставілі ў Чыгуначны РАУС.

Сябар Цянюты Сяргей Саладухін дадаў, што ён чакаў Андрэя каля яго дома на плошчы Перамогі. Замест Цянюты да яго падышлі супрацоўнікі АМАП, якія заявілі, што шукаюць злачынцу і, магчыма, Саладухін падобны на яго. «Яны абшукалі мяне, перапісалі даныя з пашпарта, некуды пазванілі і потым адпусцілі», — заявіў Саладухін.

30 верасня Цянюта вызваліўся з ІЧУ, дзе адбываў 10-сутачны арышт і трымаў галадоўку. Ён быў затрыманы 20 верасня за распаўсюджанне інфармацыйных матэрыялаў да Народнага сходу. Суд палічыў, што актывіст парушыў артыкул 23.34 КоАП, і пакараў яго арыштам. Цянюта 3 кастрычніка абскардзіў рашэнне суда, таму што лічыць яго незаконным. Народны сход праводзіцца па паведамляльным прынцыпе, і атрымліваць дазвол ва ўлад на яго правядзенне не патрабуецца, мяркуе ён.

Андрэя Цянюту міліцыя папярэдзіла аб недапушчальнасці парушэння парадку правядзення масавага мерапрыемства.

**Паводле БелаПАН**

ПАТРАБАВАННЕ

# ЗНІЗІЦЬ ЦЭНЫ!

**Група жыхароў Магілёва звярнулася да прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Мясніковіча з патрабаваннем знізіць усе цэны на 20%. Ліст, пад якім падпісаліся больш як 100 чалавек, адпраўлены кіраўніку ўрада 3 кастрычніка.**

«У беларускіх СМІ кіраўнік дзяржавы, ідэолагі абрадавалі грамадзян Беларусі, што беларускі рубель у дачыненні да амерыканскага долара і іншых валют умацаваўся на 20%», — гаворыцца ў лісце. Як зазначаюць аўтары звароту, раней улады краіны праз СМІ тлумачылі грамадзянам, што шматразовы рост цэн на тавары і аўтамабільнае паліва выкліканы ростам курсу долара.

«У сувязі з вышэйзгаданымі фактамі мы, грамадзяне Беларусі — пенсіянеры, ветэраны працы і Вялікай Айчыннай вайны, рабочыя і служачыя, члены БРСМ і партыі «Белая Русь» — патрабуем знізіць на 20% усе цэны на харчовыя і прамысловыя тавары, на медыцынскія і бытавыя паслугі, на лекавыя прэпараты, за аплату навучання, праезд у грамадскім транспарце і камунальныя паслугі, а таксама на ўсе віды паліва для аўтамабіляў і г.д.», — гаворыцца ў звароце да Мясніковіча.

Адказ на свой зварот аўтары просяць накіраваць заказным лістом на адрас ініцыятара акцыі, актывіста незалежнага прафсаюза РЭП Аляксея Паўлоўскага.

Як паведаміў Паўлоўскі, збор подпісаў пад зваротам праходзіў у межах кампаніі «Гавары праўду!». «Пастаяннае павышэнне цэн надакучыла ўсім, — заявіў ён. — Зарплату ўрэзалі пасля павышэння цэн, і нічога не індэксуецца».

Нагадаем, раней Паўлоўскі выступіў ініцыятарам збору подпісаў за вяртанне магілёўскім студэнтам бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце. У планах актывіста — запатрабаваць вярнуць ільготы пенсіянерам.

**Паводле БелаПАН**

АДУКАЦЫЯ

# ВЫНІКІ ТЫДНЯ

**З 24 верасня па 2 кастрычніка ў Беларусі праходзіў Тыдзень нефармальнай адукацыі–2011.**

На працягу васьмі дзён прадстаўнікі ўсіх накірункаў адукацыйнай сферы — дзяржаўных, недзяржаўных і бізнэсу — абмяркоўвалі найбольш праблемныя пытанні развіцця нефармальнай адукацыі ў малых гарадах і сельскай мясцовасці, а таксама тое, як з дапамогай нефармальнай адукацыі можна ўплываць на развіццё рэгіёнаў Беларусі. У рамках тыднёвага адукацыйнага форуму прайшло 48 мерапрыемстваў у 13 гарадах Беларусі.

Дык якая ж вынікоўвасць Тыдня нефармальнай адукацыі? «Мне падаецца, што тыдзень у большай ступені дазволіў паказаць рамкі для развіцця НФА ў рэгіёнах, чым прадставіць патэнцыял мясцовых і рэгіянальных арганізацый НФА ў пытаннях рэгіянальнага развіцця. Гэта значыць, мы хутчэй задавалі пытанні, якія стымулююць асэнсаванне цяперашняй сітуацыі. Гэтыя рамкі найбольш выразна былі прадстаўленыя ў выступах і дыскусіях круглага стала «Нефармальная адукацыя ў рэгіёнах Беларусі: запатрабаванні, вопыт, інавацыі». А публічную дыскусію аб пашырэнні спектру адукацыйных паслуг для жыхароў беларускіх рэгіёнаў неабходна працягваць», — лічыць Галіна Верамейчык, кіраўнік Прадстаўніцтва зарэгістраванага таварыства «Deutscher Volkshochschul-Verband eV».

Тэма Тыдня НФА–2011 — «Нефармальная адукацыя і рэгіянальнае развіццё». Па меркаванню Васіля Проня, дырэктара ТАА «Трэнінгавага цэнтра «Квадратны апельсін», мерапрыемства нагляднa прадэманстравала патэнцыял развіцця НФА ў рэгіёнах. Арганізатарамі Тыдня НФА–2011 выступілі УА «Міжнародны прыватны навучальны цэнтр падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БелТЮФ», ТАА «Трэнінгавы цэнтр «Квадратны апельсін», Асацыяцыя дадатковых адукацыі і асветы (АДОиП), прадстаўніцтва зарэгістраванага таварыства «Deutscher Volkshochschul-Verband eV» (Федэратыўная Рэспубліка Германія) у Рэспубліцы Беларусь.

КОНКУРС

# ШТО Я ВЕДАЮ ПРА ЕЎРОПУ?

**Клуб еўрапейскіх настаўнікаў і ГА «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» пры падтрымцы Асацыяцыі па міжнародных пытаннях АМО (Чэхія) і ПАГА «Рух «За Свабоду» арганізуюць восьмы рэспубліканскі конкурс школьных каманд на веданне Еўрапейскага саюза.**

Да ўдзелу ў конкурсе «Што я ведаю пра Еўропу?» запрашаюцца ў першую чаргу настаўнікі, зацікаўленыя ў актуалізацыі ведаў аб культурна-гістарычных сувязях Беларусі і Еўропы.

Конкурс прысвечаны 20-годдзю Вышаградскай групы.

Конкурсныя заданні арыентаваныя на вучняў 8–11 класаў, каманда складаецца з 5 вучняў і кіраўніка. Падрыхтоўка да конкурсу і выкананне заданняў адборачнага тура і фіналу можа быць выкарыстана настаўнікамі для паглыблення ведаў па гісторыі Беларусі і Еўропы, а таксама ў якасці пазакласнай выхаваўчай працы для настаўнікаў, зацікаўленых у выхаванні любові, гонару і патрыятычных пачуццяў да сваёй краіны.

Жадаючыя паўдзельнічаць мусяць да 21 кастрычніка даслаць выкананыя заданні адборачнага тура на электронны адрас: igken@mail.ru, а таксама пазначыць: мясцовасць, навучальную ўстанову, кіраўніка каманды, узрост удзельнікаў каманды, кантакты (мабільны тэлефон і e-mail).

Конкурс 2011 года будзе праходзіць у два этапы: паўфінал (пісьмовы адборачны тур) і фінал (камандная гульня з удзелам 3-х пераможцаў паўфіналу).

Каманды-пераможцы адборачнага тура будуць вызначаны не пазней за 25 кастрычніка. Яны паедуць на фінальную гульню ў Вільню ў апошнія выходныя лістапада або першыя выходныя снежня.

Усе выдаткі (праезд у Вільню і назад, пражыванне, харчаванне, культурная праграма) нясуць арганізатары. Удзельнікі фіналу павінны мець пашпарт, выданы не пазней 2003 года, які мае не менш за 3 свабодныя старонкі. Фіналісты атрымаюць памятныя падарункі.

**Паводле інфармацыі Руху «За Свабоду»**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# МАЎЧАННЕ — НЕВЫГОДНАЕ

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Цярпець сітуацыю моўчкі альбо выходзіць на акцыі «маўклівага пратэсту» і маўчаць, проста пляскаючы ў далоні, зараз невыгодна. Пра гэта паклапаціліся беларускія парламентары. Зараз больш выгодна ўголас абвясціць сваю нязгоду з палітыкай уладаў. Урэшце, тады ты будзеш ведаць, за што асуджаны.**

Акцыі маўклівага пратэсту з гэтага часу будуць падпадаць пад закон аб масавых мерапрыемствах. Пра гэта заявіў журналістам 5 кастрычніка намеснік старшыні камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў Анатоль Глаз, каментуючы прыняцця парламентам папраўкі ў закон аб масавых мерапрыемствах.

Пасяджэнне, на якім абмяркоўваўся праект закона, прайшло вечарам 3 кастрычніка пры адсутнасці журналістаў. Пра яго стала вядома праз суткі з паведамлення, размешчанага на сайце ніжняй палаты.

На пытанне, чаму гэты законапраект быў прыняты пры адсутнасці СМІ, Глаз, па сутнасці, так і не адказаў. «Права Палаты прадстаўнікоў вызначаць, адкрытым ці закрытым з'яўляецца парадак разгляду законапраекта», — заявіў ён.

Згодна з новым законам, арганізацыя збору грамадзян, у тым ліку з выкарыстаннем інтэрнэта, лічыцца пікетам, які павінен быць санкцыянаваны ўладамі, паведаміў Глаз. Да атрымання дазволу на мерапрыемства распаўсюджваць інфармацыю аб месцы і часе яго правядзення нельга, падкрэсліў дэпутат. Паводле яго слоў, падчас дапрацоўкі законапраекта паняцце «несанкцыянаванае дзеянне або бяздзеянне» заменена на ваным мерапрыемстве і папрасіць пакінуць яго.

Глаз не змог даць канкрэтнага адказу на пытанне, ці трэба падаваць заяўкі на правядзенне акцый, накшталт Народнага сходу, які апазіцыя рыхтуе на 8 кастрычніка (арганізатары Народнага сходу не падавалі ў Мінгарвыканкам заяўку на яго правядзенне, таму што мясцовыя сходы не падпадаюць пад дзейны закон аб масавых мерапрыемствах). Аднак з яго слоў можна зрабіць выснову, што па дазвол да мясцовых улад арганізатарам усё ж давядзецца звяртацца. Пры гэтым Глаз зазначыў, што «ні тэарэтычна, ні практычна набыццё законам моцы да 8 кастрычніка немагчымае».

Унясенне папраўак у закон аб масавых мерапрыемствах МУС ініцыявала летам, калі па ўсёй Беларусі штотыднёва праводзіліся акцыі маўклівага пратэсту грамадзян, не згодных з палітыкай кіраўніцтва краіны. У першапачатковым варыянце законапраект прыраўноўваў да пікетавання нават бяздзеянне, арганізаванае ў тым ліку праз інтэрнэт для публічнага выказвання сваіх поглядаў.

Вось цікава, ці падпадуць пад «флэш-мобы», напрыклад, сустрэчы нашых футбалістаў-хакеістаў у аэрапорце, масавыя паяданні чупа-чупсаў і іншыя, не вельмі палітычныя рэчы?

У сувязі з папярэджаннем аднасна ўдзелу ў масавых мерапрыемствах Ус паведаміў, што думае, ці будзе ён прысутнічаць 8 кастрычніка на Народным сходзе. «Мяне туды ніхто не запрашаў. Але, магчыма, я прыйду туды як фізічная асоба», — сказаў Ус.

А тым часам, беларускія ўлады не страчваюць надзею атрымаць крэдыт ад Міжнароднага валютнага фонду. Місія Міжнароднага валютнага фонду па ацэнцы эканамічнай сітуацыі ў Беларусі пачала працаваць у Мінску 5 кастрычніка.

Ва ўрадзе не выключаюць, што ў рамках работы місіі гаворка можа пайсці пра фарміраванне новай праграмы МВФ для Беларусі. «Пакуль гэта будзе ацэнка, але, магчыма, перамовы пяройдуць у фазу разгляду. Гэта будзе новая праграма рэформ, па ацэнцы МВФ, дастаткова жорсткая, можа, нават больш жорсткая, чым з Антыкрызісным фондам ЕўрАзЭС», — сказаў 3 кастрычніка першы намеснік міністра фінансаў Уладзімір Амарын.

Кіраўнік місіі МВФ Крыс Джарвіс у верасні сказаў журналістам, што 5–17 кастрычніка эксперты фонду прааналізуюць апошнія падзеі ў эканоміцы Беларусі і «дадуць некаторыя дадатковыя парады».

Разам з тым пра новую праграму фінансавай падтрымкі з боку МВФ размова пакуль не вядзецца. Джарвіс адзначыў, што для выдзялення крэдыту фонд «хоча бачыць моцную і прадэманстраваную прыхільнасць з боку ўладаў, і гэта сапраўды неабходная ўмова для прасоўвання да пагаднення». «Мы не можам рэальна абмяркоўваць тое, колькі фінансавай падтрымкі Беларусі неабходна, пакуль мы не даведаемся больш пра эканамічную праграму, што ляжыць у аснове», — падкрэсліў ён.

**Унясенне папраўак у закон аб масавых мерапрыемствах МУС ініцыявала летам, калі па ўсёй Беларусі штотыднёва праводзіліся акцыі маўклівага пратэсту грамадзян, не згодных з палітыкай кіраўніцтва краіны**

«несанкцыянаванае дзеянне». На пытанне журналістаў, што канкрэтна азначае гэтае паняцце, Глаз адказаў: «Юрысты вызначаць, што гэта азначае».

Флэш-мобы ў законапраекце таксама прыраўноўваюцца да масавых мерапрыемстваў, бо месца і час іх правядзення агаворваюцца загадзя, заявіў Глаз.

Што да дзеянняў міліцыі падчас масавых мерапрыемстваў, то, паводле слоў дэпутата, супрацоўнікі праваахоўных органаў могуць быць апранутыя ў цывільнае, але перш чым затрымліваць чалавека, яны павінны назвацца, указаць на незаконнасць удзелу ў несанкцыяна-

У сувязі з гэтым вельмі дзіўна выглядае і папярэджанне былому кандыдату ў прэзідэнты Дзмітрыю Усу. Экс-кандыдата ў прэзідэнты Дзмітрыя Уса 5 кастрычніка выклікалі ў камісію па крымінальных пакараннях пры Ленінскім РУУС Мінска.

Як паведаміў Ус, у камісіі яго праінфармавалі аб умовах кантролю за ім. «Сказалі, што, згодна з крымінальным заканадаўствам, яны абавязаныя паставіць мяне на прафілактычны ўлік. Я падпісаў паперы, што буду даваць інфармацыю, калі збяруся выехаць за межы Беларусі. Мяне таксама папярэдзілі аб недапушчальнасці ўдзелу ў масавых мерапрыемствах», — сказаў ён.

Старшыня праўлення Нацбанка Надзея Ермакова 3 кастрычніка паведаміла, што з цяперашняй місіяй МВФ будзе разглядацца пытанне аб прыцягненні дадатковых крэдытаў для рэфінансавання тых, тэрміны вяртання якіх хутка наступаюць. Як паведаміла журналістам Ермакова, Беларусь хацела б атрымаць ад МВФ 5–8 мільярдаў долараў для папаўнення золатавалютных рэзерваў, «каб мы адчувалі сябе ўпэўнена па міжнародных стандартах». Але, як адзначыла яна, пра такую суму, напэўна, размова не пойдзе.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МАРЫНА ДАМАНЦЭВІЧ



Беларуска Марына Даманцэвіч стала пераможцай марафону, які прайшоў у славацкім Кошыцэ. Марына Даманцэвіч вяла барацьбу з эфіопскай бягунняй на працягу ўсёй дыстанцыі, але пасля 35-га кіламетра пайшла ў адрыў, усталяваўшы асабісты рэкорд (2 гадзіны 33 хвіліны 53 секунды).

«Я хацела паказаць больш высокі вынік, але сёння гэта было немагчыма, таму засяродзілася на тым, каб заняць першае месца. Маёй задачай у гэтым сезоне было выканаць кваліфікацыйны нарматыў для ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях, што і ўдалося зрабіць», — падзялілася ўражаннямі Марына Даманцэвіч.

Другое і трэцяе месцы занялі эфіопкі: юніёрка Халіма Хасэ пераадолела дыстанцыю за 2 гадзіны 35 хвілін 47 секунд, а Сеада Кадзір Адзіла — за 2 гадзіны 36 хвілін 28 секунд.

У мужчын пераможцам стаў кеніец Эліян Кембоі, які паказаў лепшы асабісты вынік (2 гадзіны 11 хвілін 15 секунд). У спаборніцтвах таксама прыняў удзел міністр замежных спраў Славакіі Мікулаш Дзурында, які ва ўзросце 56 гадоў прабег свой 27-ы марафон за 3 гадзіны 30 хвілін 35 секунд.

У паслужным спісе Марыны Даманцэвіч таксама маюцца перамогі на марафонах у Рызе–2010 і Лодзі–2011. Фініш спаборніцтваў у Лодзі спартыўныя аглядальнікі называлі самым драматычным за ўсю гісторыю іх правядзення. Тады беларуска проста вырвала перамогу ў сваёй суперніцы, хаця на фінішы апошняя ўжо нават уздымала рукі, мяркуючы, што яна на першай прыступцы п'едэсталу.

### ГАННА ЛУКАШОК



На конкурсе ідэй навагодняга аздаблення Масквы 2-е месца заняла малады дызайнер з Наваполацка Ганна Лукашок з серыяй работ «С новым!». Спадарыня Лукашок у 2007 годзе скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, дзе вучылася на кафедры выяўленчага мастацтва. Затым працавала дызайнерам у прыватнай фірме. Год таму ў Ганны нарадзіўся сын, цяпер яна ў дэкрэтным адпачынку, паведамляюць «Народныя навіны Віцебска».

Паводле словаў дызайнера, варыянт з сімпатычнымі снегавікамі нарадзіўся досыць хутка: «Спачатку ўзнікла аналогія «С новым!» пра нараджэнне дзіцяці, бо ў мяне самой сыну год толькі. А потым атрымаўся цэлы ланцуг вобразаў».

Ганна Лукашок і раней удзельнічала ў конкурсах. У 2008 годзе яна перамагла ў VI Міжнародным моладзевым фестывалі сацыяльнай рэкламы «ART. START» у намінацыі «Плакат» са сваім дыпломным праектам — плакатам супраць курэння.

Конкурс ідэй навагодняга аздаблення Масквы праводзіўся ўпершыню, ён арганізаваны кампаніяй News Outdoor пры садзейнічанні Дэпартамента СМІ і рэкламы ўрада Масквы. Пераможцам конкурсу стаў Аляксандр Шпагін з Тальяці з працай «Свята ў сталіцы». Ён атрымаў галоўны прыз конкурсу — 100 000 расійскіх рублёў, а Ганна — 35 000 расійскіх рублёў за другое месца.

### ДЗМІТРЫЙ УС

Увечары 1 кастрычніка вызвалены з калоніі экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі на выбарах 2010 года Дзмітрый Ус. Дзмітрыя Уса вызвалілі на падставе ўказа Лукашэнкі аб памілаванні. Ніякіх прашэнняў аб памілаванні Дзмітрый не пісаў. Яго вызвалілі вельмі хутка: на працягу паўгадзіны аддалі асабістыя рэчы, пашпарт і выпусцілі з рэспубліканскай турэмнай бальніцы на Валадарскага ў Мінску, куды нядаўна этапавалі з магілёўскай папраўчай калоніі.

Дзмітрый Ус быў прызнаны вінаватым у арганізацыі масавых беспарадкаў у Мінску 19 снежня 2010 года і асуджаны на пяць з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Раней Лукашэнка падпісаў яшчэ тры ўказы аб памілаванні фігурантаў крымінальнай справы аб масавых беспарадках. 11 жніўня на волю выйшлі першыя дзевяць памілаваных, 1 верасня — яшчэ чацвёра. Трэці ўказ аб памілаванні быў падпісаны 14 верасня.

Цяпер у зняволенні застаюцца яшчэ два экс-кандыдата ў прэзідэнты — Андрэй Саннікаў і Мікалай Статкевіч.



▸ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ЗАЛАТАЯ РЭШТА

Вольга ХВОІН

**Аляксандр Лукашэнка працягвае, «кіруючыся прынцыпамі гуманнасці», вызваляць палітвязняў. На свабоду выйшаў экс-кандыдат у прэзідэнты Дзмітрый Ус. За кратамі застаюцца некалькі асобаў, у тым ліку ключавых у палітычным жыцці краіны. Іх вызваленне адцягваецца ў часе і адначасова абстаўляецца застрашваючым антуражам.**

Калі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Саннікаву нават дазволілі сустрэцца на спатканні з жонкаю, то старшыня «Маладога Фронту» — моладзевай арганізацыі, зарэгістраванай у Чэхіі, — апошнія дзевяць месяцаў зняволення параўноўвае з катаргаю. Асабліва адзначылася кіраўніцтва горацкай калоніі, дзе Дашкевіч утрымліваўся. Дашкевіч меў шматлікія скаргі на нестатутнае абыходжанне з ім у турме, якое можна трактаваць як катаванні. Два месяцы да яго не маглі трапіць адвакаты.

Цяпер Дашкевіч — у глыбокскай калоніі. Журналіст сайту westki.info атрымаў ліст ад Дашкевіча, у якім ён просіць «маякнуць нашым, што ў яго ўсё добра». «Тут працуюць сумленныя людзі, каторыя кіруюцца толькі законам, і яны не маюць ніякага дачынення да бясчынстваў, якія тварыліся і творацца ў Горках. Даць такую інфармацыю трэба тэрмінова», — гаворыцца ў лісце.

Лідар «Маладога Фронту» Зміцер Дашкевіч быў затрыманы разам з Эдуардам Лобавым 18 снежня 2010 года. Маладафронтаўцаў абвінавацілі ў хуліганстве і асудзілі да пазбаўлення волі.

Цікава, што лісты з падрабязнасцямі пра жорсткія ўмовы ўтрымання пачалі даходзіць цягам апошняга месяца. «Выпадкова» на этапе з Дашкевічам у адной камеры апынуўся Андрэй Саннікаў, які перадаў праз сваю жонку такія словы: «Ратуйце Дашкевіча любымі спосабамі, інакш ён не выжыве». Дашкевічу прапаноўвалі напісаць прашэнне аб памілаванні, але ён адмовіўся.

У зняволенні застаецца давераная асоба Саннікава Дзмітрый Бандарэнка. Нядаўна ён упершыню патэлефанаваў з магілёўскай калоніі. «Было першае тэлефанаванне, і першы раз ён схадзіў у турэмную краму, «атаварыўся». Лісты даходзяць усе, але вельмі дзіўна — пачкамі. Восем дзён не было маіх лістоў, а потым адразу перадалі 5 лістоў. Ён піша: «Адчуваю, што будзе нейкая падлянка, і вось калі здарылася такое з Саннікавым і Дашкевічам, не расслабляюся і нечага з трывогай чакаю», — распавяла ягоная жонка Вольга.

Абмежаванне волі на «хіміі» ў вёсцы Куплін Пружанскага раёна адбывае сустаршыня аргкамітэту па стварэнні БХД Павел Севярынец.

Экс-кандыдат у прэзідэнты Мікалай Статкевіч 5 кастрычніка сустракаўся са сваім адвакатам. Як расказала жонка Статкевіча Марына Адамовіч, сустрэча прайшла з парушэннем правоў асуджанага: «Сустрэча праходзіла не адзін на адзін, як таго патрабуе заканадаўства, а праз шкло, праз перамоўную трубку, у прысутнасці кантралёра, які фактычна мадэраваць размову і перыядычна выключаў гук пры зносінах Статкевіча з адвакатам». Адвакат паведаміў жонцы Статкевіча, што ў яго «праходзіць траўма», якую ён атрымаў, працуючы на лесапільні ў калоніі. Аднак, як адзначыла Адамовіч, да цяжкіх работ Статкевіча паранейшаму не дапускаюць.

Ужо два месяцы, як быў арыштаваны Алесь Бяляцкі (яго, дарэчы, вылучылі на Нобелеўскую прэмію міру за заслугі ў справе абароны правоў чалавека 2012 года). Справа Бяляцкага ўжо перададзеная ў пракуратуру, пасля чаго яна будзе скіраваная ў суд. Алесь Бяляцкі ўжо пачаў знаёміцца з матэрыяламі сваёй справы.

Прапановы падпісаць прашэнне аб памілаванні ёсць і Мікалаю Аўтуховічу — ваўкавыскаму прадпрымальніку, асуджанаму на 5 гадоў узмоцненага рэжыму нібыта за незаконнае захоўванне пяці патронаў і паляўнічай стрэльбы. Ён адбывае пакаранне ў Івацэвіцкай калоніі.

«Ціск на яго працягваецца. Мікалая абмяжоўваюць у пасылках, у сустрэчах з жонкай. І як іншых палітзняволеных, угаворваюць падпісаць паперу, што прызнаўся ў садзеяным і гатовы стаць на шлях выпраўлення, ад чаго ён катэгарычна адмаўляецца. Да яго таксама падсылаюць людзей, каб справакаваць бойку або нейкае сур'ёзнае правапарушэнне, каб потым павялічыць тэрмін. Ён сказаў, каб я перадаваў усім, што ён пакуль трымаецца», — распавядае са словаў палітвязня яго давераная асоба Алег Волчак.

Да ліку палітзняволеных на гэтым тыдні праваабарончы цэнтр «Вясна» і Беларускі Хельсінскі Камітэт дадалі Ігара Аліневіча, Мікалая Дзядка, Аляксандра Францкевіча — яны былі асуджаныя да зняволення нібыта за падпал Дома правасуддзя ў Мінску. «РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт», эксперты праваабарончай супольнасці Беларусі па выяўленых аб'ектыўных крытэрах лічаць Ігара Аліневіча, Мікалая Дзядка, Аляксандра Францкевіча, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, палітычнымі зняволенымі дзеючага ў Беларусі рэжыму», — гаворыцца ў адпаведнай заяве праваабаронцаў.

Падчас саміту «Усходняга партнёрства», што праходзіў у Варшаве, быў прыняты «пакет прапаноў» для Беларусі. Еўропа прапанавала даць Беларусі дзевяць мільярдаў еўра ў абмен на выкананне некаторых патрабаванняў. Сярод іх — вызваленне і рэабілітацыя палітвязняў, перамовы ўлады з апазіцыяй, свабодныя парламенцкія выбары. Адстаўкі прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ЕС не патрабуе. Афіцыйны Мінск (запрашэнне было накіраванае міністру МЗС Сяргею Мартынаву) удзел у саміце праігнараваў.

▸ ПАДТРЫМКА

# НЕФАРМАЛЬНЫЯ ПАСОЛЬСТВЫ БЕЛАРУСІ

Вольга ХВОІН

**У верасні распачалі сваю працу беларускія дамы ў Варшаве, Вільні, Львове. Грамадскія ініцыятывы па-за межамі Беларусі ставяць сабе за мэту яднаць беларускіх мігрантаў ды стварыць пляцоўкі для свабодных сустрэч прадстаўнікоў палітычных і грамадскіх структур.**




Алег Мяцеліца запрашае на офіс

У Варшаве «Беларускі дом» месціцца ў старой камяніцы ў самым цэнтры сталіцы на вуліцы Вейскай, 13. Грамадская арганізацыя «Беларускі дом» хоча інтэграваць беларусаў, якія апынуліся ў Варшаве, ладзіць беларускія імпрэзы або дапамагаць тым, хто па палітычных прычынах быў вымушаны пакінуць краіну. У Варшаве цяпер беларуская супольнасць налічвае некалькі тысяч чалавек. Сярод іх значную частку складаюць студэнты-каліноўцы, журналісты, палітэмігранты.

«Беларускі цэнтр» у Львове, паводле заяваў яго стваральнікаў, будзе «спрыяць аб'яднанню дэмакратычных сіл у барацьбе з рэжымам Аляксандра Лукашэнкі, а таксама наладжванню украінска-беларускага супрацоўніцтва». Падобныя беларускія цэнтры плануецца стварыць яшчэ ў некалькіх украінскіх гарадах.

Грамадзянскае і палітычнае прадстаўніцтва Беларусі ў Літве адкрылася пры падтрымцы кіраўніка Камітэту па замежных справах Эмануэліса Зінгерыса, міністра замежных спраў Літвы Аўдронюса Аджубаліса. Яны паспрыялі прыняццю рашэння аб адкрыцці офіса, мэрыя горада дапамагла з памяшканнем. Пасольствы Канады і Польшчы перадалі мэблю і аргтэхніку. Кіраўнік віленскага офіса Алег Мяцеліца з ліку асобаў, якія партызанскімі шляхамі пасля 19 снежня праз Расію выехалі з Беларусі. Паводле яго слоў, зімою падавалася, што палітычнае і грамадскае поле ў Беларусі выпрасуюць так, што не застанецца ніякіх магчымасцяў для працы. Таму ідэю стварыць такую пляцоўку за мяжой палітэмігранты выношвалі даўно. Пра гэта я і размаўляла з кіраўніком Грамадзянскага і палітычнага прадстаўніцтва Беларусі ў Літве Алегам МЯЦЕЛІЦАМ.

— Мне пакуль цяжка сказаць, чым мы адрозніваемся ад офісаў, створаных у Варшаве і Львове. Гэта пляцоўкі, дзе беларуская апазіцыя, грамадскі сектар могуць знаходзіць прытулак па-за межамі краіны. Я б хацеў прывесці прыклад Польшчы. У Літве ёсць пасольства Польшчы, але паралельна працуе польскі дом, дзе праводзяцца розныя мерапрыемствы. Калі глядзець у будучыню, то стварэнне беларускіх дамоў можа быць падмуркам для далейшага супрацоўніцтва.

Да нас ужо прыязджалі прадстаўнікі палітычных арганізацый. У Вільню амаль штодня прыязджае нехта з прадстаўнікоў палітычных партый, грамадскіх арганізацый. І мы запрашаем усіх прыходзіць да нас у Вільні на вуліцу Басанавічуса 35,1. Ёсць памяшканне, ёсць інтэрнэт — гэта добрая магчымасць для сустрэч.

***— Ці разглядаеце магчымасць вярнуцца цяпер у Беларусь?***

— Мяркую, што цяпер можна было б вярнуцца. І ўсё, відаць, абышлося б толькі нейкімі выклікамі ў міліцыю, «прафілактычнымі гутаркамі», проста далі б зразумець, што нічога нам не забыліся. Але ёсць абавязальніцтвы, адказнасць за сам офіс. Мы толькі пачалі нармальна працаваць — цягам лета рабілі рамонт, наводзілі парадак. Цяпер мы рэгулярна праводзім розныя акцыі ў Літве. Рабілі і акцыі апладысментаў у сем гадзін на чыгуначным вакзале, акурат у гэты час адыходзіць цягнік у Беларусь. Скажу, што было вельмі прыемна назіраць, калі цэлымі вагонамі людзі апладзіравалі.

***— Вам не падаецца, што гэтыя акцыі ўжо згубілі сэнс, бо яны выліліся ў бязмэтавае дзеянне?***

— Так, акцыю, напэўна, варта было па восені яшчэ колькі разоў правесці ў мабілізуючым фармаце, а потым дадаваць патрабаванні да ўладаў.

***— Ёсць меркаванне, што афіцыйная Літва насамрэч асцерагаецца пераменаў у палітычным ладзе Беларусі.***

— У прыватных размовах літоўцы самі гавораць, што змены ў Беларусі для Літвы справакуюць не вельмі добрую сітуацыю. Гэта перанакіруе транспартныя плыні, дзесяцімільённая Беларусь перацягне на сябе шмат рэсурсаў. Беларусь зможа ўслых заявіць пра свае нацыянальныя інтарэсы, а Літва проста застанецца на ўскрайку Еўрасаюза. Беларусь больш цэласная за Літву ў нацыянальным плане. Літоўскія палітыкі, якія прыкладаюць руку да палітычных трансфармацый у Беларусі, з аднаго боку, кіруюцца салідарнасцю, бо памятаюць падзеі ўнутры іх краіны на пачатку 1990-х, а з іншага — кіруюцца матывамі ўласнага кар'ернага росту, бо гэта дадае бонусы для іх іміджу ў вачах еўрапейскіх чыноўнікаў.

***— У Вільні ёсць Дом правоў чалавека, дзе праходзіць многа сустрэч, мерапрыемстваў. Вы цяпер з імі канкуруеце?***

— У іх ёсць пэўныя патрабаванні ад донараў, яны не хочуць, каб праваабарончая арганізацыя была ўцягнутая ў палітычныя варункі. Увогуле, мяркую, што палітычным арганізацыям было б карысна мець тут сваіх прадстаўнікоў. Напрыклад, ад аргкамітэта па стварэнню Беларускай хрысціянскай дэмакратыі тут некалькі месяцаў працаваў іх прадстаўнік. І гэта істотна пасрыяла пашырэнню іх міжнародных сувязяў.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

# ПАЗЫКІ ПАД ЗАКЛАД

Вольга ХВОІН

**Нацыянальнае агенцтва інвестыцый і прыватызацыі (НАІП) разам з Сусветным банкам і фінансавымі кансультантамі займаюцца прыватызацыяй васьмі прадпрыемстваў Беларусі. У бягучым годзе Беларусь плануе атрымаць ад прыватызацыі каля 100 мільярдаў рублёў.**

У «спіс васьмі» патрапілі ААТ «Баранавіцкі камбінат жалезабетонных канструкцый», ААТ «Белсантэхмантаж–2», ААТ «Аўтамагістраль», ААТ «Будаўніча-мантажны трэст №8», ААТ «Белгазбуд», ААТ «Медпласт», ААТ «Конфа» і ААТ «Мінскі маргарынавы завод». Гэтыя прадпрыемствы ўваходзяць у План прыватызацыя на 2011–2013 гады, зацверджаны пастановай Саўміна. Пры садзейнічанні Сусветнага банка і ўрада Аўстрыі Беларусь атрымае фінансаванне ў памеры 5 мільёнаў долараў на ажыццяўленне прыватызацыі гэтых аб'ектаў. З часткі гэтых сродкаў будзе аплачваца праца фінансавых кансультантаў.

Залаты запас Беларусі — «Беларуськалій», «Белтрансгаз», СТАА «МТЗ», МАЗ будуць прыватызоўвацца па рашэнню Аляксандра Лукашэнкі. Другая палова акцый «Белтрансгаза», відавочна, адыдзе расійскаму «Газпраму». Прынамсі старшыня праўлення «Газпрама» Аляксей Мілер пасля сустрэчы з Лукашэнкам заявіў, што перамовы прайшлі «надзвычай паспяхова». Было дасягнутае пагадненне аб продажы беларускай долі — 50% акцый беларускай газатранспартнай кампаніі «Белтрансгаз», што пастаўляе газ у Еўропу.

Яшчэ адзін гігант расійскага рынку «Уралкалій» праяўляе стабільную цікаўнасць да набыцця кантрольнага пакета акцый «Беларуськалія». Аднак, як заяўляў генеральны дырэктар «Уралкалія» Уладзіслаў Баумгертнер, пакуль не бачна жадання беларускіх уладаў рэалізаваць актыў. «На цяперашні момант проста няма падстаў меркаваць, што беларускі ўрад разглядае магчымасць продажу кантрольнага пакета. Нас сапраўды цікавіць менавіта кантрольны пакет», — падкрэсліла гендырэктар.

Ён таксама адзначыў, што бягучая сітуацыя на фондавых рынках не спрыяе абмеркаванню як гэтай, так і іншых здзелак па зліцці і паглынання. У такой сітуацыі, лічыць Баумгертнер, «зрабіць адэкватную ацэнку» «Беларуськалія» «няма магчымасці». Аляксандр Лукашэнка заяўляў аб гатоўнасці прыватызаваць «Беларуськалій» зыходзячы з ацэнкі ў 30 мільярдаў долараў.

Баумгертнер таксама паведаміў, што «Уралкалій» некалькі месяцаў таму спыніў абмеркаванне пытання аб прадастаўленні «Беларуськалію» крэдыту ў памеры 1 мільярд долараў. «Пасля гэтага яны пачалі мець кантакты з «Ашчадным банкам» для атрымання крэдыту, мы ўжо не маем да гэтага ніякага дачынення», — сказаў гендырэктар.

Раней Беларусь адмовілася ад крэдыту «Ашчаднага банка РФ» і Deutsche Bank у 2 мільярда долараў пад заклад 35% акцый «Беларуськалія». Але ў выніку беларускі бок дамовіўся з «Ашчадным банкам» аб выдзяленні крэдыту «Беларуськалію» на 1 мільярд долараў пад заклад 50% акцый нафтаперапрацоўчага заводу «Нафтан».

Магчымасцю набыць акцый «Беларуськалія» цікавіцца таксама Індыя. Прапанова аб набыцці акцый прадпрыемства ўжо накіраваная кіраўніцтву Беларусі.

Прыватызацыйныя працэсы адбываюцца на фоне пагаршэння міжнародных фінансавых рэйтынгаў Беларусі. Так, агенцтва Standard & Poor's у чарговы раз панізіла доўгатэрміновы крэдытны рэйтынг і рэйтынг фінансавай устойлівасці Беларускай нацыянальнай перастрахавачнай арганізацыі з «В» да «В-». Прагноз — негатыўны.

Паніжэнне рэйтынгаў абумоўлена тым, што захоўваецца залежнасць Беларусі ад знешняга фінансавання з прычыны вялікага дэфіцыту па рахунку бягучых аперацый і вельмі нізкага ўзроўню даступных рэзерваў. У агенцтве сумняваюцца, што Беларусь здолее прыцягнуць фінансаванне ў неабходных аб'ёмах.

«У нас застаюцца вялікія сумневы з нагоды здольнасці краіны забяспечыць такое фінансаванне, і мы лічым, што да цяперашняга моманту ўрад Беларусі распачаў толькі абмежаваныя меры па ліквідацыі прычын знешняга дысбалансу. Гэта аказала істотны ціск на афіцыйны абменны курс, які мы лічым завышаным, і пагоршыла стрэсавую сітуацыю ў эканоміцы краіны», — гаворыцца ў паведамленні агенцтва.

Акрамя таго, у Standard & Poor's адзначылі, што ўслед за зменамі абменнага курсу ў гэтым годзе істотна вырасла пазыковая нагрузка ўрада па абавязальніцтвах у замежнай валюце ў адносінах да ВУП. Паводле ацэнак агенцтва, да канца 2011 года яна павялічыцца амаль у 2 разы, гэта значыць, да ўзроўню больш за 40%.

ГРОШЫ

# ІНТЭГРАЦЫЯ З ДЭГРАДАЦЫЯЙ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Нават звычныя да самапахвальбы беларускія кіраўнікі не спяшаюцца святкаваць перамогі, якія краіна атрымлівае ў сферы знешняга гандлю. Насамрэч, памеры таваразвароту, экспарту і імпарту значна павысіліся. Але адначасова павялічыўся знешнегандлёвы дэфіцыт: калі за 7 месяцаў мінулага года адмоўнае сальда ў гандлі таварамі склала 4,2 мільярда долараў, то за 7 месяцаў бягучага года — 4,3 мільярда.**

І гэта нягледзячы на значнае павялічэнне экспарту прадуктаў нафтаперапрацоўкі, інвестыцыйных тавараў і прадуктаў харчавання. Небывалая дэвальвацыя рубля дзеля таго і рабілася, каб звузіць унутраны попыт на беларускія тавары. У выніку насельніцтва збяднела, а дзеля пастаўленай мэты з краіны вывезлі столькі мяса і малака, што гэтых тавараў не хапіла нават на задавальненне яго нязначных патрэб.

У гэтай сувязі ўспамінаецца колішні румынскі дыктатар Чаўшэску, які даводзіў румынам, што спачатку трэба разлічыцца па знешніх пазыках, а ўжо потым можна будзе папіць удосталь румынскага віна. А пакуль экспарт перад усім. Як вядома, румынам крышку не хапіла цярпення, і яны брутальным спосабам скінулі свайго айца-правадыра.

Зразумела, параўнанні ў такой справе — рэч не вельмі ўдзячная, але ж адзначым, што ў нашы дні асобныя палітыкі робяць спробу аднавіць сітуацыю, якая існавала да 1991 года. Маем на ўвазе так званы Савет эканамічнай узаемадапамогі (СЭУ), створаны ў 1949 годзе. Штаб-кватэра арганізацыі па сацыялістычнай інтэграцыі, якія была задумана як альтэрнатыва Еўрапейскай эканамічнай супольнасці («агульнаму рынку»), месцілася, зразумела, у Маскве. У розныя часы ў склад СЭУ ўваходзілі СССР, ПНР, ЧССР, ГДР, СРР, НРБ, МНР, НСРА (Народная сацыялістычная рэспубліка Албанія), Рэспубліка Куба, СРВ і СФРЮ ў якасці асацыяванага сябра.

У якасці назіральнікаў былі запрошаны Народная Рэспубліка Ангола, Народная Дэмакратычная Рэспубліка Йемен, Рэспубліка Нікарагуа, Лаоская Народна-дэмакратычная Рэспубліка, Народная Рэспубліка Мазамбік.

Як бачым, кампанія падабралася спрэс дэмакратычная, зразумела, народная і еўраафразійская. Мэта дагнаць і перагнаць імперыялістаў шляхам калектыўнага выкарыстання пераваг сацыялістычнай эканомікі над рынкавай. Шляхам сацыялістычнай інтэграцыі. На самай справе атрымалася нешта кшталту сацыял-эканамічнага, добраахвотнага гета, сяброўства ў якім стала гарантыяй кансервацыі тэхнічнага і тэхналагічнага адставання ад сусветных лідараў. У СЭУ СССР адводзілася роля донара інтэграцыі, астатнія выступалі спажыўцамі яго рэсурсаў. Толькі пастаўкі на льготных умовах нафты ў рамках СЭУ абышліся Савецкаму Саюзу ў 50 мільярдаў долараў у коштах 1970 года. А для сваіх патрэб краіна Саветаў змушана была пазычаць усюды, дзе можна.

Самае дзіўнае, што пасля фармальнай ліквідацыі гэтай унікальнай формы калектыўнага міжнароднага гаспадарання, СССР завінаваціў сваім ненажэрным хаўруснікам 15 мільярдаў інвалютных рублёў. І мусіў сплачваць.

Другім магутным цэнтрам сацыялістычнай інтэграцыі пад прыглядам «крамлёўскіх лятуценнікаў» быў Варшаўскі дагавор, міралюбівая ваенная арганізацыя, у якую ўваходзілі амаль што ўсе сябры СЭУ.

У выніку Савецкую Армію давялося ратаваць ад голаду заходняй гуманітарнай дапамогай, а ці не ўсе былыя «браты па класу і па зброі» ў поўным складзе ўступілі ў NATO.

Добра, што ў савецкага народа хапіла пачуцця гумару. Маглі б разадраць на кавалкі сваіх кіраўнікоў, былых сацыялістычных інтэгратараў, якія пусцілі па ветру на мільярды долараў эканамічных даброт, што стваралiся дзесяцігоддзямі. А было за што і судзіць, і караць.

Якое дачыненне ўсё гэта мае да сучаснай Беларусі? Самае непасрэднае. Яна ці не адзіная засталася з цесным хаўрусе з Расіяй, чым пагадзілася на кансервацыю сваёй тэхніка-тэхналагічнай і сацыяльна-эканамічнай адсталасці. Нават амаль усю сваю прамысловую прадукцыю Беларусь прадае ў Расію. Уяўляецца, не таму, што адчувае інтэргацыйную еднасць, а таму, што больш ніхто не хоча яе купляць. А ў Расіі тое ж самае — ніхто, прыкладам, не хоча купляць расійскія легкавікі. Нават самі расіяне, нават беларусы, якіх змушаюць ратаваць расійскі аўтапрам вялікімі мытамі на іншамаркі. Яны будуць спажываць наша недапечанае, а мы іхняе недаваранае? Каму гэта патрэбна? Час, калі трэба было неяк прыстасоўвацца і лагодзіць адзін аднаму, даўно скончыўся. І Расіі, і Беларусі, і Казахстану даўно час адкрываць для сябе ўвесь свет, не абмяжоўваючыся рамкамі няўдалага, разбуральнага сацыяльна-эканамічнага эксперыменту.

Аб'ядноўвацца толькі дзеля таго, каб апаніраваць Еўрасаюзу ды іншым больш паспяховым і прадказальным супольнасцям, зусім не варта. Прыкладам, калі адкінуць Расію, Украіну, у некаторай ступені Казахстан, то астатнія краіны СНД для Беларусі, можна сказаць, не існуюць у эканамічным плане. На іх прыпадае меней за 10% беларускага экспарту. А імпарту яшчэ меней. Увогуле, можна пагадзіцца з Леніным, які лічыў, што перад тым, як аб'ядноўвацца, карысна на нейкі час раз'яднацца. Каб паглядзець, хто і чаго варты.



Нейкія стасункі можна ладзіць з тымі краінамі, ад якіх можна атрымаць эканамічныя выгоды сёння і ў будучым. Прычым выгоды стратэгічнага кшталту ў выглядзе стварэння вытворчасцяў і прадпрыемстваў, у першую чаргу коштам прамых інвестыцый адказных капіталістаў, прадукцыя якіх будзе з цягам часу канкурэнтаздольнай не толькі на 1/6 часткі свету, населенай беднымі жыхарамі, не толькі ў Венесуэле ці іншых дастаткова экзатычных дзяржаўных утварэннях, а паўсюль, куды дападзе энергічны беларускі негацыянт.

Кажуць, што ніхто нас не чакае ў Еўропе, а Расія цягнецца з адкрытымі абдымкамі. Можа, яно і так, але патрабуюцца ўдакладненні. Каб трапіць у Еўропу, дастаткова стварыць у сябе еўрапейскія ўмовы, адпаведныя стандарты — і Еўропа з вялікім задавальненнем сама завітае да нас. Бо мы — краіна пакуль што еўрапейская, а не якая там еўразійская. Мільёны беларусаў, хто па сваёй волі, а хто і пад прымусам, удзельнічалі ў адбудове Расіі. Пераважна на яе малапрыдатных для камфортнага пражывання акраінах. Пуцін мусіць памятае пра гэта. І калі абяцае стварэнне для ўсіх адзінай эканамічнай прасторы, не забывае падкрэсліць, што для насельнікаў адзінай эканамічнай прасторы адмена міграцыйных, памежных і іншых бар'ераў, так званых «працоўных квот», зробіць магчымым выбіраць месца, дзе жыць без усякіх абмежаванняў, атрымоўваць адукацыю, працаваць. А не так, як у СССР — з яго інстытутам прапіскі, — дзе такой свабоды не было.

Хоць, мусіць, нейкая свабода ўсё ж была, бо не ўсіх даставілі на месца працы ў таварных вагонах. Але ж у Расіі, як і ў Беларусі, замест прапіскі з'явілася рэгістрацыя. З адпаведнымі абмежаваннямі. Што казаць, Пуціна, мусіць, не прапісалі б у Маскве, калі б яго не запрасіла на працу ў Крэмль Таня Дзьячэнка. А каб Юры Лужкоў ведаў, што з гэтага атрымаецца, то, мусіць, не дапамагло б і хадайніцтва дачкі Ельцына.

А куды прапішуць шаpаговага беларуса, калі ён падасца ў гастарбайтэры, і гадаць не трэба.

Што прынцыпова, дык гэта ўнураныя праблемы нерэфармаванай эканомікі, якая не можа працаваць эфектыўна нават на таннай сыравіне, не кажучы пра дарагую.

Вось гэта праблема патрабуе тэрміновага вырашэння. Усё астатняе можна вырашаць у парадку паступлення.

▸ **АДУКАЦЫЯ**

# ЕГУ РЫХТУЕ КАДРЫ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ Ў ГЭТЫМ СВЕЦЕ

**У Еўрапейскім гуманітарным універсітэце пачаўся сёмы навучальны год у выгнанні. Як вядома, ЕГУ знайшоў прытулак у Літве. Сёлета гасцям урачыстай цырымоніі адкрыцця быў прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубілюс. Прэм'ер пацвердзіў, што ёсць патрэба дапамагаць ЕГУ і суседняй Беларусі на шляху да еўрапейскіх каштоўнасцяў, росквіту, дэмакратыі і правоў чалавека. Але на адрас ЕГУ гучаць як ухвалы, так і негатыўныя рэплікі. На найбольш частыя крытычныя пытанні адказвае прарэктар па акадэмічных пытаннях прафесар Аляксандр Калбаска ў размове з журналісткай «НЧ» Вольгай Хвоін.**



Студэнтаў вітае Андрус Кубілюс

*— Што вы скажаце пра закід, што ЕГУ ўсё менш і менш робіцца беларускім? І ці ёсць у вас акцэнт на нацыянальныя традыцыі адукацыі?*

— Пытаннем на пытанне: а ці ёсць у Беларусі нацыянальная традыцыя адукацыі? Калі нехта думае, што савецкая адукацыя, якая засталася ў спадчыну сённяшняй Беларусі, ёсць адметнай нацыянальнай традыцыяй, я з гэтым не пагаджуся. Можна крытыкаваць беларускасць ЕГУ пад рознымі ракурсамі: беларускамоўнасць універсітэта, беларускі кантэкст зместу — чаму і як навучаюцца, колькасць выпускнікоў, якія вяртаюцца ў Беларусь. Для мяне беларускасць — гэта адчуванне сябе беларусам у Літве, што нашмат хутчэй і больш глыбока адбываецца ў Вільні, чым гэта было ў Мінску. У мяне ёсць магчымасць параўнаць беларускасць універсітэта мінскага і віленскага перыядаў. І я гатовы сказаць: нашмат глыбей і больш сур'ёзна беларускасць асэнсоўваецца і жыве тут, у Вільні. Калі глядзець на статыстыку — колькі выкладчыкаў карыстаюцца беларускай мовай, то гэта прыкладна карэлюе з распаўсюджанасцю беларускай мовы ў краіне. Калі 15 і менш працэнтаў жыхароў Беларусі карыстаюцца беларускай мовай, то паспрабуйце павялічыць гэты працэнт да трыццаці ў Вільні! Штучна па моўнай прыкмеце адбіраць людзей для працы ва ўніверсітэце няслушна. Яшчэ я б звярнуў увагу на колькасць сустрэч ва ўніверсітэце з дзеячамі беларускай культуры, палітыкі — ад Зянона Пазняка да Алеся Разанава. Вы мусілі заўважыць падчас адкрыцця навучальнага года, што наш універсітэт у Літве не можа быць ні чыста беларускім, ні чыста літоўскім, ні чыста англійскім. Пашукайце самі адказ на пытанне, у якой камбінацыі гэта можна ўзрасціць у жывой інстытуцыі.

*— Выступ студэнта ЕГУ на вольнай англійскай, літоўскай мовах пакінуў вельмі добрае ўражанне. Які ўвогуле ўзровень падрыхтоўкі па замежных мовах?*

— Мы вымушаныя, што далёка не ёсць практыкай усіх еўрапейскіх універсітэтаў, два гады з чатырох аддаваць моўнай падрыхтоўцы. Усе студэнты два гады абавязкова вывучаюць англійскую мову і па выбару нямецкую ці французскую, да гэтага дадаецца літоўская. На трэцім і чацвёртым курсах ёсць шэраг дысцыплінаў, якія чытаюцца на англійскай, французскай ці нямецкай мовах. Цяпер наш універсітэт праходзіць перарэгістрацыю навучальных праграм у цэнтры кантролю якасці Літвы, і наша ўнутранае патрабаванне — давесці колькасць англамоўных спецыяльных дысцыплін да 25 працэнтаў. Гэта вымагае часу. Нашы студэнты ўдзельнічаюць у абмене па праграме Erasmus Mundus, таму, каб студэнтам, якія прыедуць па абмену, было што выбіраць з дысцыплінаў, мы падвышаем колькасць англамоўных праграм да названай квоты.

*— Ці ёсць у вас праграма падтрымкі рэпрэсаваных у Беларусі студэнтаў?*

— Існуе надзвычайны фонд. Чалавек, які можа абгрунтаваць і прад'явіць доказы, што быў выключаны з ВНУ за ўдзел у палітычных акцыях, пераследаваўся КДБ, пасля паступлення мае магчымасць цягам аднаго года быць вызваленым ад аплаты навучання. Гэты год даецца, каб даказаць, чаго ў акадэмічным плане ён варты. Пасля года падтрымкі студэнт уключаецца ў агульную рэйтынгавую табліцу. У нас няма пажыццёвай падтрымкі чалавека за мінулыя палітычныя заслугі.

*— Эканамічная сітуацыя ў Беларусі паўплывала на сёлетні набор студэнтаў?*

— На шчасце, не вельмі. Але мы, адчуўшы гэтую праблему, увялі змены ў парадак аплаты. Беларускія грамадзяне могуць сёлета аплачваць сваё навучанне памесячна, у адрозненні ад прынятай практыкі аплаты за семестр наперад. Гэтае правіла распаўсюджваецца на новы набор і на студэнтаў, якія ўжо навучаюцца ва ўніверсітэце.

*— Частка месцаў на праграмах была бясплатнай для найлепшых студэнтаў. Гэтае правіла засталося?*

— Сістэма такая ж і ў гэтым годзе. Да 20-ці працэнтаў паступіўшых не будуць плаціць за вучобу ўвогуле. Наступная група — атрымліваюць зніжку восемсот еўра (аплата двух семестраў складае 1 200 і на некаторых праграмах 1 500 еўра). Наступная зніжка — 400 еўра. І рэшта студэнтаў аплачваюць тое, што мы называем «поўны кошт». Але насамрэч гэта толькі каля 30 працэнтаў ад сапраўднага кошту навучання. Гэтую рэшту кампенсуе траставы фонд з унёскаў донараў. На грамадзян Літвы і іншых краін падтрымка донараў не распаўсюджваецца. Сёлета на магістэрскай праграме, і ў завочнікаў таксама, уведзеная падтрымка студэнтаў — яны цалкам ці напалову вызваляюцца ад аплаты.

*— Колькасць студэнтаў-замежнікаў павялічваецца?*

— У бягучым годзе на бакалаўрыят паступілі 12 чалавек з Літвы, адзінкі паступілі з-за межаў Літвы. Гэта няшмат, але, параўноўваючы з мінулымі гадамі, ёсць тэндэнцыя да павелічэння цікаўнасці да ЕГУ з боку замежных студэнтаў. Універсітэт становіцца больш заўважным і вядомым у літоўскім асяродку.

*— Было многа спрэчак вакол дэпартаменту паліталогіі пасля таго, як Віктар Марціновіч, які не мае паліталагічнай адукацыі, быў прызначаны яго кіраўніком. Як бы вы ўвогуле ацанілі якасць падрыхтоўкі ў гэтым дэпартаменце?*

— Ацэнкай ведаў займаецца камісія, якая прымае абароны ў бакалаўраў і магістрантаў. Большая палова гэтай камісіі і яе старшыня не з'яўляюцца нашымі выкладчыкамі ці беларусамі. Гэта робіцца для большай аб'ектыўнасці. Што тычыцца аддзялення паліталогіі, то магу сказаць, што пад кіраўніцтвам Віктара Марціновіча якасць навучання не пагоршылася. Больш таго, дзякуючы яго практычнай палітыцы, уключанасці ў працэс прэзентацыі праграмы мы пераламалі негатыўную тэндэнцыю, калі колькасць заяў хранічна змяншалася. Цяпер мы назіраем уздым інтарэсу да гэтай праграмы.

*— У еўрапейскім рэйтынгу ВНУ я не знайшла Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.*

— Па некаторых крытэрыях мы не трапляем у прынятую сістэму каардынат. З'яўляючыся ўніверсітэтам у выгнанні, мы не ўпісваемся ў сфармуляваныя крытэры. Але я не хачу тут сказаць, што, калі б усё складвалася паводле нашага светабачання, дык мы б былі ў ТОПе. Мы далёка не лепшы ўніверсітэт Еўропы і Літвы, менавіта таму мы робім працу над памылкамі, цяпер ададаём навучальныя праграмы на перарэгістрацыю, каб яны былі больш гарманічнымі, была больш высокай планка на ўступленні і на выхадзе. Зразумела, нам цяжка канкураваць з універсітэтамі, якія працуюць у сваіх краінах дзясяткі і сотні гадоў. Не трэба ілюзій, я не збіраюся пускаць пыл у вочы. Нам яшчэ далёка нават да сяднееўрапейскіх універсітэцкіх паказчыкаў.

*— Але адукацыю ЕГУ вы ацэньваеце вышэй, чым адукацыю беларускіх ВНУ?*

— Нам цяжка адсюль рабіць параўнанні. Гэта добра ці кепска, што мы яшчэ ад 2000 года пачалі навучаць па двух узроўнях, а ў Беларусі і цяпер за бакалаўрскі дыплом выдаюць дыплом спецыяліста, які правучыўся пяць гадоў? Лёгка па той сістэме каардынат сказаць, што наш дыплом бакалаўра непаўнавартасны, бо па аб'ёму дысцыплін меншы, чым дыплом спецыяліста. Але ў гэтым і сутнасць падзелу адукацыі ў Еўропе на два ўзроўні: чалавек сам вырашае, ці трэба яму далей вучыцца, хоча ён займаць кіруючыя пасады ці займацца навукай. Пакуль не будзе аднолькавых сістэм каардынат, нам цяжка супастаўляць сябе з беларускімі ВНУ. Адтуль мы выпалі, а ўпісацца ў гэтую сістэму не вельмі лёгка.

Беларуская сістэма, і адукацыі ў тым ліку, можа з'імітаваць што заўгодна — дэмакратычныя перамены, балонскую мадэль. Іншая справа, ці захочуць еўрапейскія чыноўнікі бачыць гэтую імітацыю. Я ведаю, як няпроста было зместава змяняць пяцігадовы цыкл адукацыі на чатырохгадовы, уводзіць крэдытную сістэму, каб былі ўзаемазалікі, каб гэта ўсё працавала. Скажыце, калі ласка, на якую дысцыпліну можна па балонскай мадэлі замяніць курс «Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці»? Гаворка да таго, што з'імітаваць можна што заўгодна. Але па сутнасці рэформа вышэйшай, сярэдняй адукацыі праваліліся. І калі за гэта брацца зноў, патрэбныя добрая воля, грошы, і пятнаццаць-дваццаць гадоў жыцця. На чыю долю гэта выпадзе, я таму не зайздрошчу.

*— Хто працуе выкладчыкам у ЕГУ, якім патрабаванням яны мусяць адпавядаць?*

— Каб праходзіць акрэдытацыю, палова выкладчыцкага складу мусіць мець навуковыя ступені. На захадзе гэта PhD, у ранейшай традыцыі — ступені кандыдатаў, дактароў навук. Па некаторых спецыяльнасцях палова выкладчыкаў з такой адукацыяй набіраецца, па некаторых — не. Каб быць асноўным выкладчыкам, чалавек мусіць цалкам жыць і працаваць у Вільні. Большая частка нашых выкладчыкаў працуе вахтавым метадам. Сем'і, іх жыццё ў Беларусі. Тут яны толькі visiting professors — людзі, якія прыязджаюць толькі для выканання адміністрацыйных ці акадэмічных працэсаў.

Наш універсітэт прыцягвае моладзь, нашы выпускнікі пачынаюць выкладаць асістэнтамі і маладшымі выкладчыкамі, праўда, пакуль не маюць навуковай ступені. З аднаго боку, гэта працяг традыцыі, з іншага — паніжэнне паказчыку. І мы вымушаны балансаваць паміж запрошанымі спецыялістамі і маладшым выкладчыцкім складам. Каб гэтая сітуацыя паляпшалася, мы працуем над новай кадравай палітыкай. Стараемся зрабіць прэферэнцыі людзям, якія дэманструюць лаяльнасць да інстытуцыі, уважаючы ЕГУ за першае месца працы. З імі заключаюцца больш працяглыя кантракты, частку людзей мы гатовыя прыняць на пастаянную працу. Ёсць і праблема выбару паміж спецыялізацыяй і ўсяяднасцю. Можна набіраць вялікую колькасць выкладчыкаў, замацоўваючы за імі асобныя дысцыпліны. Калі ж чалавеку ствараць вялікую нагрузку, ён мусіць быць больш шырокім спецыялістам. Атрымліваецца, чым больш шырока чалавек прапануе свае паслугі, тым менш глыбока ён можа рэалізаваць свой патэнцыял.

Сур'ёзным інструментам падвышэння якасці выкладання з'яўляецца ананімнае анкетаванне студэнтаў па тэме выкладчыцкіх курсаў. Мы мусім быць student-friendly university — універсітэтам, які скіраваны на студэнтаў і адэкватна рэагуе на іх пажаданні.

Дарэчы, ЕГУ рыхтуе кадры для жыцця ў гэтым свеце. З першых выпускаў стацыянарнага бакалаўрыята (прыкладна 120–150 чалавек штогод) у Літве 60 з невялікім працэнтаў бакалаўраў вярнуліся ў Беларусь. Сэнс бакалаўрыята на Захадзе — падрыхтоўка і магчымасць заняць першае працоўнае месца. Каб стаць вядомым і заўважным на палітычным, акадэмічным, сацыяльным гарызонце, выпускнік універсітэта мусіць прайсці доўгі шлях, першае працоўнае месца такім звычайна не ёсць. З рэшты згаданых выпускнікоў — 40 працэнтаў — палова працягвае навучанне на другой ступені адукацыі па нашых магістэрскіх праграмах. Траціна з тых, хто застаўся, маюць фінансавую магчымасць засвойваць магістэрскія праграмы за межамі Літвы і Беларусі. І толькі нязначная частка ад 150 чалавек — прыкладна дзесяць асобаў — губляюцца з нашага поля зроку ці працаўладкоўваюцца ў Літве.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 10 кастрычніка, панядзелак

### 1

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.05** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25** Дзелавое жыццё.
**08.30** Культурныя людзі.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**11.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**12.10** Рамантычная меладрама «Байкер».
**13.50** Здароўе.
**14.20** Відэастужка АТН «Кропка адліку. Славацкі серпанцін».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Камедыя «Дзюплекс» (ЗША-Германія).
**17.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.55** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Арэна.
**19.55** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Рабінзон» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Крымінальны баявік «Элітны атрад» (ЗША-Бразілія).
**00.15** Дзень спорту.
**00.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** Контуры.
**10.15** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Марк Бернес. «Мы змаўкаем, гледзячы ў нябёсы…».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адкрыты фармат».
**22.10** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Прэм'ера. «Юльян Сямёнаў. Ён занадта шмат ведаў…».
**00.10** «След».
**01.30** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Вялікі горад».
**11.15** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм«Мама не гаруй». Расія, 1997 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**10.00** Альбарутэнія.
**10.35** Канцэрт «Electric Light Orchestra (ELO). Zoom Tour Live».
**12.25** Рэальны свет.
**12.50** Рамантычная камедыя «Закахацца ў нявесту брата» (ЗША).
**14.40** Навіны надвор'я.
**15.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.15** Медычныя таямніцы.
**16.50** Меладрама «Сяброўка Восень» (Беларусь-Расія). 1-я серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Канцэрт «Electric Light Orchestra (ELO). Zoom Tour Live».
**23.10** Авертайм.
**23.40** Меладрама «Сяброўка Восень» (Беларусь-Расія). 1-я серыя.
**00.30** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**12.25** «Ранішняя пошта».
**12.55** «Пакой смеху».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Дом ля вялікай ракі».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. Сведкі.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** Серыял «Дзявяты аддзел».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** Серыял «Сталіца граху».
**01.15** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45, 14.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). Фінал.
**10.45** Велаcпорт. Парыж - Тур. Францыя.
**12.00, 15.45, 19.15** Футбол. Еўра-2012.
**13.00** Футбол. Еўра-2012. Агляд матчаў.
**14.45** Велаcпорт. Парыж - Тур. Францыя.
**18.15** Футбол. Еўра-2012. Агляд матчаў.
**21.45** Вось дык так!!!
**21.55** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.35** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна». Часопіс.
**23.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. The Battle (ЗША).
**01.00** Футбол. Еўра-2012. Агляд матчаў.
**02.00** Футбол. Еўра-2012.
**02.25** Бізнес клас. Часопіс.
**02.30** Тэхнічны перапынак.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**08.10** «Акварыум», серыял: 4 серыя.
**09.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.15** Беларускія лёсы: «Вацлаў Іваноўскі», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**09.35** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**10.00** «Танцы з ваўкамі», маст. фільм, 1990 г., ЗША.
**12.35** «1945. год, які змяніў свет», дак. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія: 1 серыя.
**13.20** Эксперт.
**13.50** ПраСвет.
**14.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**14.25** «Танцы з ваўкамі», маст. фільм, 1990 г., ЗША.
**17.00** «Мой родны горад», серыял: 13 серыя.
**17.25** Зона «Свабоды».
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Невядомая Беларусь: «КПСС – прыгоннае права Савецкага Саюзу», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**18.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзеці-тулягі», дак. фільм, 2011 г., Польшча: 1 серыя.
**19.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.30** «Верная», дак. фільм, рэж. Насця Тарасава, 2008 г., Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.55** «Танцы з ваўкамі», маст. фільм, 1990 г., ЗША.
**00.20** Аб'ектыў.
**00.45** Гарачы каментар.

## 11 кастрычніка, аўторак

### 1

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.25** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.10** Вострасюжэтны серыял «Рабінзон» (Расія). 1-я серыя.
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**12.10** Меладрама «Шчасце маё» (Расія).
**13.55** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда»(Украіна).
**14.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм «Боцман і чыюк».
**15.55** Цыкл дакументальных фільмаў «Энцыклапедыя атама» (Расія). Частка 5-я.
**16.25** Відэастужка АТН «Яны прыйдуць у ПРАЙМ-ТАЙМ».
**16.50** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.50** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Рабінзон» (Расія). 2-я серыя.
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Камедыйны трылер «11.14» (ЗША-Канада).
**23.35** Дзень спорту.
**23.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Шматсер.фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**22.15** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Прэм'ера. «Тры жыцця Яўгенія Еўсцігнеева».
**00.15** «След».
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм«Мама не гаруй». Расія, 1997 г.
**10.00** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**10.40** «Справа адмысловай важнасці».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Каханне ў вялікім горадзе». Расія - Украіна, 2009 г.
**15.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «13-ы раён: ультыматум». Францыя, 2009 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Прэм'ера! «Жанчыны ХХ стагоддзя».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Хірамант». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**10.10** Альбарутэнія.
**10.45** Рэальны свет.
**11.10** Страсці па культуры.
**11.55** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.45** Авертайм.
**13.10** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**13.25** Фарс «Раганосец» (СССР).
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Меладрама «Сяброўка Восень» (Беларусь-Расія). 2-я серыя.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Адборачны раўнд. Беларусь - Грэцыя. Прамая трансляцыя.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** «Беларуская часіна».
**22.25** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**23.30** Спорт-кадр.
**00.00** Меладрама «Сяброўка Восень» (Беларусь-Расія). 2-я серыя.
**00.50** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Дом ля вялікай ракі».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Дом ля вялікай ракі».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. Сведкі.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Серыял «Дзявяты аддзел».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.40** Прэм'ера. «Вайна супраць сваіх».
**00.35** Серыял «Сталіца граху».
**01.15** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўра-2012.
**10.15** Футбол. Еўра-2012. Агляд матчаў.
**11.15** Вось дык так!!!
**12.15** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). Фінал.
**13.00** Велаcпорт. Парыж - Тур. Францыя.
**14.00** Футбол. Еўра-2012.
**16.30** Футбол. Еўра-2012. Агляд матчаў.
**17.30** Фехтаванне. Чэмпіянат свету. Італія. Дзень 4-ы.
**20.00** Футбол. Еўра-2012.
**20.15** Вось дык так!!!
**20.30** Футбол. Еўра-2012. Агляд матчаў.
**21.30** Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна». Часопіс.
**22.00** Бокс. Міжнародны паядынак.
**23.45** Аўтаспорт. Дарога да Дубаі. Часопіс.
**00.00** Футбол. Еўра-2012. Агляд матчаў.
**01.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Барселона. Агляд.
**01.30** Ралі IRC. Шатландыя. Агляд.
**02.00** Матаспартыўны часопіс.
**02.15** Вось дык так!!!
**02.30** Тэхнічны перапынак.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Першая сустрэчная», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**09.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.25** «Мой родны горад», серыял: 13 серыя.
**09.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.05, 15.05** Еўропа сёння.
**10.30, 16.25** Невядомая Беларусь: «КПСС – прыгоннае права Савецкага Саюзу», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**11.00** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**11.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзеці-тулягі», дак. фільм, 2011 г., Польшча: 1 серыя.
**12.15** «Гняздо», серыял: 3 серыя.
**13.10** «Першая сустрэчная», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**14.40** «Мой родны горад», серыял: 13 серыя.
**15.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзеці-тулягі», дак. фільм, 2011 г., Польшча: 1 серыя.
**17.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 3 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Эксперт.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Арол», серыял: 11 серыя.
**19.00** Два на два (тэледыскусія): Зянон Пазняк і Сяргей Навумчык.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** На колах.
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.45** Рэпартэр.
**22.10** «Прыстань», прыгодніцкі серыял: 2 серыя.
**22.55** Басанож па свеце.
**23.20** Аб'ектыў.
**23.45** Гарачы каментар.

## 12 КАСТРЫЧНІКА, СЕРАДА

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 15.00, 19.00, 00.00** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтарэсаў». Эканамічная праграма.
**09.10-15.00** Тэхнічная прафілактыка.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм «Боцман і чыюк».
**15.55** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**16.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.55** Меладраматычны серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Рабінзон» (Расія). 3-я серыя.
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Трылер «Грошы на дваіх» (ЗША).
**00.10** Дзень спорту.
**00.25** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**06.00, 09.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10-16.00** Тэхнічная прафілактыка.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Прэм'ера. «Шчаслівыя разам». Шматсерыйны фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**22.15** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Асяроддзе пасялення.
**00.15** «След».
**01.35** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**09.10-15.00** Тэхнічная прафілактыка.
**15.00** «Пяць гісторый».
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Хлопцы да лямпачкі». ЗША - Францыя, 1995 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.35** «Дабро пажаліцца».
**23.55** «Хірамант». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна).
**09.05-15.05** Тэхнічная прафілактыка.
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Меладрама «Сяброўка Восень» (Беларусь-Расія). 3-я серыя.
**17.50** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Барыс (Астана). Прамая трансляцыя.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Тэлебарометр.
**21.35** «Беларуская часіна».
**22.35** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**23.35** Меладрама «Сяброўка Восень» (Беларусь-Расія). 3-я серыя.
**00.25** Рэальны свет.

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00-15.00** Прафілактыка.
**15.00** Гарадок.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Дом ля вялікай ракі».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** «Гістарычны працэс».

НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**09.00-15.10** Прафілактыка.
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Марскія д'ябылы».
**21.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Увага: вышук!».
**00.20** Вострасюжэтны серыял «Сталіца граху».
**01.05** Серыял «Школа».

EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Дарога да Дубаі. Часопіс.
**09.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Барселона. Агляд.
**10.15** Вось дык так!!!
**10.30** Футбол. Еўра-2012. Агляд матчаў.
**11.30** Футбол. Еўра-2012.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). Дзень 3-і.
**20.45** Футбол. Еўра-2012.
**20.55** Абранае па серадах.
**21.05** Конны спорт. Кубак нацый. Агляд.
**22.05** Навіны коннага спорту.
**22.10** Гольф. PGA. Турнір FRYS.COM Open.
**23.10** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.15** Ветразевы спорт. Экстрэмальная серыя. Бостан.
**23.45** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**23.50** Абранае па серадах.
**23.55** Гольф. Пункт прызначэння - гольф. Часопіс.
**00.00** Фехтаванне. Чэмпіянат свету. Італія. Дзень 5-ы.
**02.00** Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна». Часопіс.
**02.30** Тэхнічны перапынак.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.35** «Арол», серыял: 11 серыя.
**08.30** Два на два (тэледыскусія): Зянон Пазняк і Сяргей Навумчык.
**09.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 3 серыя.
**09.25** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.50** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**10.20** Сальда (эканамічная праграма).
**10.35** Госць «Белсату».
**10.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**11.00** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**11.20** «Гняздо», серыял: 4 серыя.
**12.10** «Арол», серыял: 11 серыя.
**13.05** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.35** «Тры шалёныя нулі», серыял: 3 серыя.
**14.00** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**14.25** Сальда (эканамічная праграма).
**14.45** Два на два (тэледыскусія): Зянон Пазняк і Сяргей Навумчык.
**15.10** Госць «Белсату».
**15.25** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**15.35** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**15.55** МакраФон: «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 1.
**16.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**16.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 3 серыя.
**17.30** «Геркулес», дак. фільм, 2004 г., Польшча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», прыгодніцкі серыял: 2 серыя.
**18.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**18.55** «Дарога Статкевіча», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Непамілаваны», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**21.45** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 10 серыя.
**22.15** Два на два (тэледыскусія): Зянон Пазняк і Сяргей Навумчык.
**22.40** Аб'ектыў.
**23.05** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 13 КАСТРЫЧНІКА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.15** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Вострасюжэтны серыял «Рабінзон» (Расія). 3- я серыя.
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**12.10** Меладраме «Вячэрняя казка» (Украіна).
**14.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільмы «Боцман і чыюк», «Вяртанне блуднага чыюка».
**15.55** «Чарнобыль. 25 гадоў пасля. Выновы і ўрокі». Дакументальны фільм (Расія).
**16.55** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**17.55** Меладраматычны серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Рабінзон» (Расія). 4-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў.
**22.30** VI Міжнародны фэст Юрыя Башмета. Адкрыццё.
**00.30** Дзень спорту.
**00.40** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Шматсер. фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**22.15** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.15** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.45** «Звароты адлік».
**00.15** «След».
**01.35** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «Хлопцы да лямпачкі». ЗША - Францыя, 1995 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! Фільм «Клаанг: вайна гладыятараў». Італія, 2009 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Хірамант». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**10.55** Альбарутэнія.
**11.30** Канцэрт «Eros Ramazzotti. Live In Roma».
**13.10** Рэальны свет.
**13.35** «Адлюстраванне месяца. Аіда Імангулієва». Дак. фільм (Азербайджан).
**14.20** Фільм-прыпавесць «Сад» («Беларусьфільм»).
**15.55** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**16.15** Медычныя таямніцы.
**16.50** Меладрама «Сяброўка Восень» (Беларусь-Расія). 4-я серыя, заключная.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Канцэрт «Eros Ramazzotti. Live In Roma».
**23.05** Час футболу.
**23.50** Меладрама «Сяброўка Восень» (Беларусь-Расія). 4-я серыя, заключная.
**00.40** Рэальны свет.

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.10** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Дом ля вялікай ракі».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Дом ля вялікай ракі».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Паядынак».

НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** Серыял «Дзявяты аддзел».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Марскія д'ябылы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** Сёння.
**23.40** Фільм з цыклу «Жывыя легенды».
**00.30** Серыял «Сталіца граху».
**01.25** Серыял «Школа».

EUROSPORT

**09.30** Конны спорт. Кубак нацый. Агляд.
**10.30** Футбол. Еўра-2012.
**14.00** Футбол. Еўра-2012. Агляд матчаў.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/8 фіналу.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. The Battle.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Татальны накаўт.
**23.00** Баявыя мастацтвы. Румынія.
**00.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**00.40** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.45** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/8 фіналу.
**02.30** Тэхнічны перапынак.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 10 серыя.
**08.00** «Прыстань», прыгодніцкі серыял: 2 серыя.
**08.45** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 2 серыя.
**09.15** Праект «Будучыня».
**09.40** «Маё жыццё для Яго», дак. фільм, 2004 г., Польшча.
**10.35** Госць «Белсату».
**10.50** Без рэтушы: «Непамілаваны», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**11.10** Навігатар.
**11.25** Эксперт.
**11.55** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 10 серыя.
**12.20** «Прыстань», прыгодніцкі серыял: 2 серыя.
**13.05** Праект «Будучыня».
**13.35** Без рэтушы: «Непамілаваны», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**13.55** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 2 серыя.
**14.20** Эксперт.
**14.50** «Маё жыццё для Яго», дак. фільм, 2004 г., Польшча.
**15.40** Навігатар.
**15.55** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**16.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.25** Без рэтушы: «Непамілаваны», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**16.45** Хто ёсць кім?: Алесь Бяляцкі – абаронца правоў чалавека.
**17.00** «Сонечная дзіда», серыял: 7 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Басанож па свеце.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Госць «Белсату».
**18.25** «Акварыум», серыял: 4 серыя.
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Дзіцячая гара», дак. фільм, 2008 г., Румынія–Германія.
**22.55** «Навенькая», дэтэктыўны серыял: 3 серыя.
**23.40** Аб'ектыў.
**00.05** Гарачы каментар.

## 16 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.25** VI Міжнародны фэст Юрыя Башмета.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Арсенал.
**09.40** Зброя.
**09.55** Фартыфікацыя.
**10.40** Відэафільм АТН «Дзяржынская пастараль» цыклу «Зямля беларуская».
**10.50** Серыял «Сваты-4» (Украіна).
**12.10** Меладрама «Мачаха» (СССР).
**13.55** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Адмысловы рэпартаж АТН «Час: збіраць камяні…».
**15.50** Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Нацыянальнай тэатральнай прэміі.
**18.10** Суперлато.
**19.15** Эксцэнтрычная камедыя «Карсіканец» (Францыя).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Серыял «Сваты-4» (Украіна).
**23.10** Баявік «Моцны арэшак-3: Адплата» (ЗША).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** «Фазэнда».
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.40** «Прыгоды Васі Куралесава». Мультфільм.
**13.05** Камедыя «Утаймавальніца тыграў».
**15.00** «Ірына Мірашнічэнка. Адкрыцці».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.30** Асяроддзе пасялення.
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Гонар нацыі».
**22.10** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**00.55** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт Аляксандра Іванова.

### СТВ

**07.15** «Салдаты. Дзембельскі альбом» Серыял.
**09.00** «Аўтапанарама».
**09.30** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.30** «Вялікі сняданак».
**11.10** Фільм «Целаахоўнік «. ЗША - Вялікабрытанія, 2010 г.
**13.05** «Добры дзень, доктар».
**13.35** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**13.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Тарпеда» Жодзіна - «Дынама» Мінск. Прамая трансляцыя.
**16.00** «Я - вандроўца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Каханне ў вялікім горадзе 2». Расія, 2010 г.
**22.25** Фільм «Нацягнутая цеціва».Японія - Карэя Паўднёвая, 2005 г.
**00.00** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### Лад

**06.50** Рамантычная камедыя «Кейт і Лео» (ЗША).
**08.55** «Правы чалавека».
**09.10** Дабравест.
**09.35** Мір вашай хаце.
**09.50** Тэлебарометр.
**09.55** Фантастычная меладрама «Змяркане. Сага. Маладзік» (ЗША).
**12.25** Кінаспробы.
**12.55** Страсці па культуры.
**13.50** Серыял «Маргоша» (Расія).
**15.55** Хакей. КХЛ. Ак Барс (Казань) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**18.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Ньюкасл - Тотэнхэм.
**20.25** Навіны надвор'я.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Рамантычная камедыя «Кейт і Лео» (ЗША).
**23.25** Канцэрт « Justin Timberlake. Live From Madison Square Garden».

### РОССИЯ

**07.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.20** Фільм «Знайдыш». 2009 г.
**09.05** Тэлесерыял «Даішнікі. Працяг».
**10.00** Сённа.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Гістарычны фільм «Казачая быль».
**13.30** «Смехапанарама».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.30** «Гарадок». Дайджэст.
**15.25** Прэм'ера. «У космас з сацлагера. Выкрадзеная слава».
**16.20** Фільм «Мама выйшла замуж».
**18.05** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Самотны анёл».
**22.55** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.55** Фільм «Ніколі не размаўляйце з невядомымі».

### НТВ

**07.30** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Крамлёўскія дзеці».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** «Таемны шоў-бізнэс: «Ласкавы май».
**22.55** «Нтвшнікі».
**00.00** Фільм «Страшныя лейтэнанты».

### EUROSPORT

**09.30** Фехтаванне. Чэмпіянат свету. Італія.
**10.30** Марафон. Амстэрдам.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/2 фіналу.
**13.45** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**14.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Заезд 1.
**15.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету.
**17.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Заезд 1.
**17.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Заезд 2.
**18.30** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). Фінал.
**20.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. Францыя. 1/2 фіналу.
**21.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. Францыя. Фінал.
**22.00** Бокс. Bigger's Better. Вільнюс (Літва).
**00.00** Матаспорт. Матаспартыўны часопіс.
**00.15** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). Фінал.
**01.15** Супербайк. Чэмпіянат свету. Заезд 2.
**02.15** Матаспорт. Матаспартыўны часопіс.
**02.30** Тэхнічны перапынак.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**07.45** Госць «Белсату».
**08.00** «Доктар Марцін», серыял: 6 серыя.
**08.50** «Сонечная дзіда», серыял: 7 серыя.
**09.15** Калыханка для самых маленькіх.
**09.45** Чаму дэмакратыя? 4 серыя: «У пошуках Гандзі».
**10.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**11.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.30** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 7 серыя.
**12.15** Два на два (тэледыскусія): Яўген Вапа і Хведар Нюнька.
**12.45** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.10** Калыханка для самых маленькіх.
**13.40** Невядомая Беларусь: «Шанц на «Новае жыццё», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**14.10** «Доктар Марцін», серыял: 6 серыя.
**14.55** «Наўцёкі», маст. фільм, 1994 г., ЗША.
**16.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Малая Масква», серыял: 1 серыя.
**18.00** Два на два (тэледыскусія): Яўген Вапа і Хведар Нюнька.
**18.25** «1945. год, які змяніў свет», дак. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія: 2 серыя.
**19.10** Калыханка для самых маленькіх.
**19.20** Дакументальная гадзіна: «Чэшская мара», дак. фільм, 2004 г., Чэхія.
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.10** Фільматэка майстроў: «Цудам ацалелы», маст. фільм, 2004 г., Польшча.
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.45** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**00.25** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

---

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029)) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольгв
Бабруйск (8029) 628 75 01 Вольга
Слуцк (8044) 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ВЫБАРЫ

# ЗАГАДКА ПАЛІКОТА

**18 кастрычніка ў Польшчы адбудуцца парламенцкія выбары, сюрпрызам якіх можа стаць прарыў у Сейм партыі алігарха Януша Палікота. Пра феномен Палікота журналісту «НЧ» Алегу Новікаву распавядае польскі палітолаг Войцех Залуска.**



***— У афіцыйных дакументах партыя Палікота называе сябе сацыял-ліберальнай. Ці ёсць у польскай палітыцы традыцыя або школа сацыял-лібералізму?***

— Сярод прыхільнікаў Палікота ёсць некаторыя палітыкі, якіх можна лічыць левымі лібераламі. Аднак, на маю думку, асаблівай ролі ідэалогія ў стварэнні руху не адыграла. Платформай для паўстання Руху падтрымкі Палікота (афіцыйная назва партыі) была фрустрацыя часткі электарату лібералаў і левых, не задаволеных ростам уплыву Касцёла. Істэрыка вакол катастрофы пад Смаленскам прымусіла гэту частку соцыуму забыць пра фрустрацыю, пачаць нешта рабіць, шукаць формы арганізацыі. Палітычная эліта, якая ахвотна ўдзельнічала ў жалобных урачыстасцях і набажэнствах, не зразумела, што адбываецца. Толькі дэпутат Януш Палікот выпадкова, інтуітыўна або з нейкімі прагматычнымі мэтамі, выказаў падтрымку антыклерыкальным ініцыятывам і стаў (магчыма, нечакана для сябе) лідарам цэлай грамадскай групы.

***— Рух падтрымкі Палікота знешне падобны на так званыя партыі алігархаў, якія распаўсюджаныя ў былым СНД. Ці не баіцца польскае грамадства паўтарэння такога сумнага досведу?***

— У адрозненні ад той жа Украіны, у нас няма такой практыкі, калі алігархі ішлі ў палітыку. Звычайна, багатыя людзі напросту лабіруюць свае інтарэсы праз нейкія партыі. Таму ініцыятыва Палікота не ўспрымаецца выбарцамі адназначна як нешта негатыўнае. Акрамя таго, Януш Палікот — вельмі арыгінальная персона, якая не падобная на постсавецкіх алігархаў. Яму не характэрныя снабізм або карпаратыўны цынізм. Напрыклад, на знак салідарнасці з сэксуальнымі меншасцямі ён хадзіў у майцы «Я гей».

***— Што можна сказаць наконт эканамічных поглядаў Палікота?***

— Януш Палікот выступае за пашырэнне свабоды для бізнэсу. Хіба што ў прыватных інтэрв'ю ён больш спасылаецца на свой асабісты вопыт (ён зарабіў грошы на продажы алкаголю). Аднак, з іншага пункту гледжання, такі падыход мала чым адрозніваецца ад эканамічных блокаў партый. Акрамя таго, тое, што напісана ў выбарчых праграмах, часта напісана выключна для выбараў. Можна ўзгадаць ліберальныя рэформы левых дэмакратаў у 2002–2005 гадах кшталту рэалізацыі плана Хаўснера, які цалкам супярэчыў праграмным пастулатам. Левыя «палікотаўцы» звяртаюць увагу на тое, што іх лідар паслядоўна выступае супраць так званых часавых працоўных кантрактаў. На іх думку, гэта значыць, што патэнцыйна Палікот здольны перайсці на левыя пазіцыі. Тым больш, што ён сапраўды толькі пачаў шукаць сваё месца ў палітыцы.

***— Гжэгаш Наспіральскі, лідар Саюзу левых дэмакратаў (SLD), кажа пра пагрозу «палікатызацыі» польскай палітыкі. На яго думку, прыход у палітыку бізнэсмэна, які лёгка гаворыць пра розныя складаныя матэрыі, пагражае вульгарызацыяй палітычных дэбатаў. Палікот — гэта другі Лепер?***

— Так, Палікот дастаткова не звычайна паводзіць сябе на розных палітычных шоу. Яго лексіка больш простая і прымітыўная за мову больш дасведчаных палітыкаў. Аднак, я не думаю, што ён камусьці пагражае. Польская культура палітычных дэбатаў дастаткова слабая. Паглядзіце, як спрачаюцца нашы палітыкі. Галоўным аргументам усё роўна застаецца наяўнасць кампрамату на апанента і нахабства падчас дэбатаў.

***— А ці ёсць кампрамат на Палікота?***

— Колькі заўгодна. У свой час Януш Палікот адказваў у адной з камісій Сейма за размеркаванне сродкаў для развіцця гарадоў. Яго шмат крытыкавалі за тое, што грошы выдаваліся непразрыста, часам на незразумелыя праекты. Палікот вельмі слаба як дэпутат праявіў сябе ў ролі змагара з Касцёлам. Фактычна, за ўсю сваю папярэднюю кадэнцыю дэпутата ён ні разу не крытыкаваў царкву, супраць якой цяпер заўзята змагаецца. Не зразумелая сітуацыя з прынцыпам фармавання выбарчых спісаў. Там зашмат нікому не вядомых дробных бізнесменаў, якім відавочна проста хочацца трапіць ва ўладу.

***— Фемінізм і антыклерыкальныя лозунгі Палікота вельмі блізкія каштоўнасцям левых. Аднак Левыя дэмакраты не падтрымліваюць рух Палікота, не шукаюць з ім кантактаў. Наадварот, як сведчыць згаданае выказванне Наспіральскага, яны хутчэй крытыкуюць яго.***

— Польскія левыя — гэта партыя алігархаў, якая доўгі час і вельмі не кепска эксплуатавала настальгію па камуне. Цяпер лозунг вяртання ў PLR (Польская народная рэспубліка) выглядае як утопія. Саюз шукае новую, больш маладую сацыяльную базу. Так, ён, напрыклад, прапанаваў частку месцаў у выбарчым спісе Зялёным. Палікот выступае тут як канкурэнт. Пра намер галасаваць за ягоны рух заявіў Ежы Урбан, рэдактар вядомай антыклерыкальнай газеты «Nie», вельмі аўтарытэтная асоба сярод электарату SLD.

***— Галоўным козырам Руху Палікота з'яўляюцца антыклерыкальныя лозунгі. Чаму тэма абароны прынцыпаў цывільнасці дзяржавы настолькі важная? І чаму менавіта зараз паўстала такая партыя з выразным антыклерыкальным абліччам?***

— Салідная палітыка ў Польшчы не можа праводзіцца без як мінімум лаяльнага стаўлення Касцёлу. Нават у камуністычныя часы царква была часткай сістэмы. Пасля краху камуны роля Касцёла вырасла яшчэ больш. Па сутнасці, ксяндзы на месцах фармуюць электаральныя сімпатыі. Гэта прымушае ўрад, нават калі ён ліберальны або левы, увесь час шукаць лаяльнасць кліру праз саступкі. Гэта можа быць больш жорсткая версія закону супраць абортаў або вяртанне пад кантроль Касцёлу часткі нацыяналізаваных у часы PLR зямель. Гэта тэндэнцыя клерыкалізацыі грамадства яскрава праявіла сябе падчас жалобы па ахвярах смаленскай катастрофы і выклікала адваротную рэакцыю.

***— 19 верасня агенцтва SMG/KRC апублікавала дадзеныя сацыялагічнага апытання, адпаведна якім Рух Палікота карыстаецца найбольшай падтрымкай сярод выбаршчыкаў ад 18 да 24 гадоў. Ці не ёсць Рух Палікота нейкай польскай рэдакцыяй маладзёвых пратэстаў, якія зараз ахапілі ўвесь свет?***

— Рух супраць арганізаваных кансерватарамі маніфестацый пад прэзідэнцкім палацам, з якога пазней узнік Рух Палікота, узнік у інтэрнэце. Адзін малады чалавек арганізаваў праз сеціва контр-маніфестацыю, пасля якой і пачалася фармавацца ініцыятыва вакол Палікота. Аднак на гэтым пакуль усе асацыяцыі з рухам у тых жа арабскіх краінах заканчваюцца. Праект Палікота ўсё ж больш вузкі і персанальны. Прагматычны. Ён накіраваны не на змену рэжыму, а на стварэнне лева-ліберальнай партыі, якая будзе часткай палітычнага істэблішменту, кшталту нямецкіх Зялёных.

***— Зараз у Палікота 6 працэнтаў папулярнасці, што дае яму шанс прайсці выбарчы бар'ер. Калі партыя Палікота здолее трапіць у парламент, ці можа яна ўвайсці ў кабінет, які, мяркуючы па ўсім, зноў будзе створаны на базе Грамадзянскай платформы?***

— Думаю, так. Тым больш, што, па словах таго ж Палікота, у яго з Дональдам Тускам заключаны на час кампаніі пакт пра тое, каб асабліва жорстка адзін аднаго не крытыкаваць.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Місія МВФ будзе шукаць доказы прагрэсу ў рэформах, якія б апраўдалі крэдыт. Беларусь, у сваю чаргу, разлічвае атрымаць каля сямі мільярдаў долараў ад МВФ, але эксперты лічаць, што краіна можа атрымаць меншую суму або наогул нічога. У цэлым, цяперашні візіт місіі МВФ з'яўляецца «тэхнічным», паколькі палітычная напруга знаходзіцца на такім высокім узроўні, што гаворка пра дамову хуткім часам не ідзе.

**«The Wall Street Journal» (ЗША)**

Агенцтва Standard & Poor's панізіла крэдытны рэйтынг Беларусі і выставіла негатыўны прагноз. На думку экспертаў, золатавалютных рэзерваў Мінску (а іх усяго \$4,6 мільярда) хопіць на фінансаванне імпарту толькі на паўтара месяцы. Становішча крытычнае. Але ў базавым сцэнары развіцця падзей, па S&P, ужо фігуруе \$1 мільярд, які Беларусь атрымае ад расійскага «Сбербанка». Усе загадкі разгаданыя, акрамя адной. А ці варты рэжым Лукашэнкі таго, каб у чарговы раз адцягваць яго ўсё адно немінучы эканамічны крах? Да таго ж, не высоўваючы ніякіх выразных умоў наконт выдачы крэдыту, Расія ператвараецца ў адказнага за тое, што адбываецца ў Беларусі, прычым на баку тых, хто вядзе краіну да краху.

**«Новая газета» (Расія)**

Пекін афіцыйна не кажа пра ўмовы давання «сяброўскіх» пазык, што цалкам задавальняе Лукашэнку, які ў першую чаргу імкнецца паказаць, што застаецца гаспадаром у краіне. Кітай, у сваю чаргу, пераследуе тыя ж інтарэсы, што і Расія: ён спрабуе адхапіць большы кавалак падчас прыватызацыі прамысловых актываў. Акрамя таго, У Банго падпісаў дамову пра прыватызацыю і кітайскія інвестыцыі ў Беларусь у 2011–2013 гадах. Гэта значыць, што Пекін і Масква ўступаюць у прамую барацьбу за беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы, аграпрамысловы комплекс і машынабудаўнічыя прадпрыемствы.

**«Le Temps» (Швейцарыя)**

«Белая Русь» стваралася абсалютна прагматычна, у мэтах гульні са значнай часткай чыноўніцтва. Прэзідэнт не планаваў стварэнне партыі ўлады, а меркаваў бясконца доўга гуляць на гэтай тэме з мэтай зніжэння пратэстнага патэнцыялу ў асяроддзі службоўцаў. Але цяпер цярпенне беларускай наменклатуры з улікам найцяжкага эканамічнага становішча і адсутнасці ўсякіх перспектыў лопнула, і яна вырашыла, што ў наступным парламенце яна павінна быць прадстаўлена як клас.

**REGNUM (Расія)**

Беларускі прэзідэнт заявіў, што не прападзе без еўрапейскай падтрымкі, бо разлічвае на дапамогу Расіі. Аднак эксперты мяркуюць, што і тут Лукашэнка хітраваў. Па-першае, расійскае кіраўніцтва ўжо неаднаразова давала зразумець, што проста так падтрымліваць існуючую ў суседняй краіне ўладу не збіраецца. Па-другое, ад Расіі зыходзіць значна большая пагроза для яго аднаасобнай улады, чым ад Еўропы, для якой можна па-майстэрску імітаваць дэмакратызацыю і лібералізацыю. Па-трэцяе, папулісцкая эканамічная палітыка прывяла да таго, што нізкіх коштаў на газ для выратавання сітуацыі ўжо недастаткова.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. БЕЗ РАСІІ НЕ БЫЛО Б УКРАІНСКАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

Здаецца, ступень патрыятызму ўкраінцаў наўпрост залежыць ад сітуацыі ў Расіі. Пра гэта піша польская газета «Rzeczpospolita» са спасылкай на дадзеныя Кіеўскага міжнароднага інстытута сацыялогіі. Калі верыць установе, украінцы актыўна рэагуюць на падзеі ў суседзяў, змяняючы свае палітычныя сімпатыі. Так, колькасць прыхільнікаў незалежнасці Украіны значна вырасла за час першай чачэнскай вайны. Тады група незалежнікаў ва Украіне павялічылася з 54 працэнтаў да 74. А самыя рэкордныя параметры патрыятызму былі зафіксаваныя падчас расійска-грузінскага канфлікту ў Паўднёвай Асецііі. На той час пакласці галаву за незалежнасць былі гатовыя 82 працэнты ўкраінскіх грамадзян. Тыя ж тэндэнцыі, як сведчаць сацыялагічныя замеры, назіраюцца і падчас газавых войнаў. «Калі б не Расія, ці ўвогуле быў бы ва Украіне патрыятызм», — жартуе польскае выданне.

**Паводле «Rzeczpospolita» (Польшча)**

### КІРГІЗІЯ. БІЧ БОЖЫ БЫЎ КІРГІЗАМ?

Кіргізскі прафесар Амангельды Бекбалаеў прадставіў даклад па сваёй новай кнізе «Атыла — продак кіргізаў». Аб'ект разгляду навуковай манаграфіі, прадстаўленай на днях, перыяд кіргізскай гісторыі II–VII стагоддзяў, калі продкі кіргізаў — гуны, ці гунакіргізы (так іх называе Бекбалаеў) арганізавалі, на думку аўтара, пяцісотгадовы паход у Еўропу. Менавіта яны з'явіліся, маўляў, першапрычынай так званага Вялікага перасялення народаў і крушэнні Заходняй Рымскай імперыі. У нарысе прыводзіцца сем пэўных навукова-гістарычных доказаў, што гуны і кіргізы па-сутнасці складалі адзін і той жа народ. Гэтыя доказы грунтуюцца на гістарычных, археалагічных, лінгвістычных, культуралагічных і медыка-генетычных фактах. Вось такая тэорыя. Такім чынам, славуты правадыр гунаў Атыла, якога называлі Біч Божы, аказваецца, быў суайчыннікам Бакіева. З улікам таго, што суседнія таджыкі, паводле афіцыйных гісторыкаў, ёсць старажытнымі арыямі, нічога дзіўнага ў тэзісах Беклабаева няма.

**Паводле кіргізскай прэсы**

### ВЕНЕСУЭЛА. ЛЮДЗІ НЕ ВЕРАЦЬ, ШТО ЧАВЕС ЗДАРОВЫ



Іспанскае выданне «El Pais» сцвярджае, што венесуэльцы не вераць у афіцыйную версію хваробы прэзідэнта Чавеса. Адпаведна ёй, Уга здолеў вылечыцца ад раку з дапамогай серыі сеансаў хіміятэрапіі, якія ён прайшоў на Кубе. Навіна пра выздараўленне прэзідэнта была апублікаваная на ўсіх афіцыйных установах. Адначасова СМІ паведамілі, што Чавес цалкам гатовы да ўдзелу ў прэзідэнцкай кампаніі, якая адбудзецца ў наступным годзе. Між тым, даверу да дыягназу, які паставіў сам сабе лідар балівarскай рэвалюцыі, здаецца, няма. Так, Роджэр Нар'ега (Roger Noriega), прадстаўнік ЗША пры Арганізацыі Амерыканскіх Дзяржаў (галоўная рэгіянальная структура), кажа, што здароўе Чавеса знаходзіцца пад вялікай пагрозай. Жоўтая прэса ж сцвярджае, што шансы Чавеса дажыць да дня выбараў — 50 на 50.

**Паводле «El Pais» (Іспанія)**

### ІСПАНІЯ. АПОШНЯЯ КАРЫДА Ў КАТАЛОНІІ

20 тысяч каталонскіх прыхільнікаў бою быкоў сабраліся 27 верасня на арэне La Monumental у Барселоне, каб пабачыць магчыма апошнюю карыду ў гісторыі краю. Цяпер гэты атракцыён, які цягнецца больш за 650 гадоў, забаронены, паколькі прызнаны супярэчным прынцыпам гуманізму і экалогіі. Магчыма, аднак, што каталонцы забаранілі карыду толькі таму, каб насаліць Мадрыду. Цяпер Каталонія — адзіны рэгіён, дзе нельга забіваць быкоў. У сваю чаргу аматары карыды лічаць, што забарона карыды — часовая мера. «Каталонія за быкоў», — скандавалі яны падчас стыхійнай маніфестацыі пасля заканчэння бою на арэне La Monumental. Магчыма, іх аптымізм звязаны з працэсам у Вярхоўным судзе, які хутка павінен разглядзець іск іспанскіх нацыяналістаў пра тое, што забарона каталонцамі карыды ёсць замах на канстытуцыйныя правы грамадзян.

**Паводле «Gazeta Wyborcza» (Польшча)**



ЦІКАВА

# ПУЦІНСКІ ЗАСТОЙ

**Вяртанне Пуціна ў якасці прэзідэнта адбываецца на фоне праслаўлення Брэжнева — савецкага рэкардсмена па тэрміну знаходжання на пасадзе кіраўніка дзяржавы.**



Прычынай казаць пра тое, што Пуцін — рэінкарнацыя «дарагога Леаніда Ільіча, стаў з'езд «Адзінай Расіі», які прайшоў два тыдні таму ў «Лужніках». Мерапрыемства справакавала ў рунэце мноства параўнанняў расійскай афіцыйнай партыі з КПСС. Бурныя апладысменты пасля кожнай рэплікі любімага кіраўніка, лозунгі і транспаранты, патрыятычныя песні групы «Любэ» і г. д.

І ў якасці фінальнага акорду — навіна пра намер Пуціна вярнуцца на пасаду прэзідэнта. З улікам асабліваццяў расійскіх выбараў, можна не сумнявацца, што ён будзе федэральным лідарам яшчэ два тэрміны — 12 гадоў. Калі згадаць, што Пуцін ужо два разы быў гарантам па пяць гадоў, атрымліваецца ўвогуле фантастычная лічба знаходжання ў Крамлі — 22 гады.

Такім чынам, Уладзімір Уладзіміравіч ідзе на пабіцце рэкорда Леаніда Ільіча Брэжнева, які прабыў генсекам КПСС 18 гадоў. Пра тое, што значылі для краіны апошнія гады брэжнеўскага кіравання, большасці насельніцтва больш-менш вядома нават без падручнікаў гісторыі. Пры Брэжневе Савецкі Саюз увайшоў у стадыю сістэмнага крызісу, з якога, па сутнасці, выйсці не змог, нягледзячы на Перабудову. Не дзіўна, што ў публікі адразу ўнікла пытанне, ці не закончыцца пуцінская эра гэтак жа?

У дадатак варта згадаць, што Пуціна сталі параўноўваць з Брэжневым не сёння. Яшчэ перад выбарамі 2008 года Гарбачоў заявіў у інтэрв'ю часопісу «Time», што Пуцін і Брэжнеў не толькі падобныя па стылю кіравання, але і ім абодвум «пашанцавала кіраваць краінай у той час, калі ў свеце назіраўся рост коштаў на нафту».

Ёсць і іншыя паралелі. Знешняя палітыка Пуціна вельмі нагадвае агрэсіўныя геапалітычныя планы Савецкага Саюза ў 1970-я гады, калі «халодная вайна» была ў зеніце.

Каб развеяць асцярогу, Крэмль пачаў казаць, што Брэжнеў — гэта не негатыў, а суцэльны пазітыў. У эфіры тэлеканала «Дождж» прэс-сакратар прэм'ер-міністра Дзмітры Пяскоў папракнуў крытыкаў «брэжневізацыі Пуціна» ў слабых ведах гісторыі і «маскоўскім пафасе». Па словах Пяскова, кіраванне Брэжнева не было застоем. «Краіна многага дабілася, Брэжнеў для нашай краіны — гэта велізарны плюс», — разважаў Пяскоў.

Спробы рэабілітацыі Брэжнева выклікалі ў грамадстве гучны смех. Расійскія палітыкі і бізнэсмэны, апытаныя часопісам «Власть», лічаць, што ў Пуціна не так і шмат шанцаў стаць другім Леанідам Брэжневым: «У Пуціна няма пакуль што ніводнага звання Героя. У яго часцей змяняецца атачэнне, чым у Брэжнева. І ён не зможа мець такія бровы, як у генсека. Пры Брэжневе быў застой. Пры Пуціне — адстой», — напісаў адзін з расійскіх блогераў.

Аднак пры ўсіх жартачках тэндэнцыя ўладнага дыскурсу выклікае ў палітолагаў насцярожанасць. Услаўляючы эпоху Брэжнева, улада ўскосна дасылае сігнал пра тое, што да 2024 года ніякіх прагрэсіўных рэформаў не будзе. Гэта шок для актыўнай часткі грамадства. Страціўшы Мядзведзева на пасадзе кіраўніка дзяржавы, ліберальная частка расійскага грамадства, без якой немагчымая мадэрнізацыя эканомікі, страціць адзіную надзею. Не выпадковыя лічбы: па выніках апошніх апытанняў, 22% расіян жадалі б з'ехаць з краіны, а сярод прадпрымальнікаў і студэнтаў гэты паказчык яшчэ вышэй — кожны другі.

**Расійскія палітыкі і бізнэсмэны, апытаныя часопісам «Власть», лічаць, што ў Пуціна не так і шмат шанцаў стаць другім Леанідам Брэжневым**

Ужо зразумела, што надаваць дынаміку грамадскаму жыццю Пуцін будзе з дапамогаю патрыятычных лозунгаў. Нельга не прызнаць, што агучаны ім у суботу план стварэння Еўразійскага саюза знайшоў, калі меркаваць па каментарах у рунэце, падтрымку.

Тут можна натыкнуцца на забаўныя перлы: «Знешнепалітычны курс ВВП можна і трэба за шматлікае крытыкаваць. Але пуцінскае імкненне зноў запусціць у былым СССР інтэграцыйныя працэсы — гэта тое, што цалкам адпавядае нашым нацыянальным інтарэсам. Нічога не страчана, усё толькі пачынаецца! Еўразійцы гатовыя далучыцца да рэалізацыі ідэй Пуціна, падтрымаць сваёй энергіяй, ведамі і інтэлектам. Расія яшчэ будзе вялікай еўразійскай дзяржавай у саюзе з усімі народамі Еўразіі. Слава Пуціну і Еўразійскаму саюзу!» — піша адзін з віртуальных патрыётаў.

Аднак казаць, што імперскія настроі дамінуюць у грамадстве, нельга. Нацыяналістычнага пафасу ў тым жа рунэце не так шмат.

Відавочна, папросту пуцінская формула патрыятызму надакучыла, і на працягу наступных 12 гадоў яна будзе губляць сваю прывабнасць яшчэ больш. Як добра пракаментаваў нейкі блогер: «ВВП спёкся даўно... і яго гульні».

Нарэшце для падтрымкі патрыятычных настрояў трэба нейкая канфрантацыя. Гэта ўстаноўка на канфлікт прысутнічае ў шматлікіх каментарах патрыётаў: «Зараз пра сумнае. Упэўнены, што хуткім часам пачацца тэрарыстычныя акты на нашай тэрыторыі з мэтай дыскрэдытацыі цяперашняга ўрада і персанальна Уладзіміра Пуціна. Бо трэба ж штосьці з мядзведзем, які абудзіўся, рабіць, а тое ўсё пад сябе падграбе, ды яшчэ і, хай Бог сцеражэ, новую валюту — «азіа» — увядзе».

У перспектыве ёсць вялікія шансы, што пуцінская сістэма зможа эластычна рэагаваць на знешнія выклікі. Як вядома, Леанід Ільіч на некаторым этапе аказаўся закладнікам створанай сістэмы. Канфігурацыя ўлады выглядала так, што выключна ён мог гарантаваць баланс уплыву ведамасных і рэспубліканскіх кланаў. Пры тым, што ён сам неаднаразова хацеў пайсці ў адстаўку.

Нельга ў гэтым плане не пагадзіцца з брытанскай газетай «Guardian»: «Перспектыва яшчэ двух прэзідэнцкіх тэрмінаў У. Пуціна набліжае сацыяльную і эканамічную стагнацыю ў краіне і штурхае на параўнанні са шматгадовым кіраваннем савецкага кіраўніка Леаніда Брэжнева».

З іншага боку, брэжневізацыя пуцінскага рэжыму, магчыма, не самы горшы варыянт.

Як піша ўкраінскі палітолаг Кісялёў, ідэя рэстаўрацыі імперыі з'яўляецца асабістым бзікам Пуціна, а 2017 год — сотая гадавіна развалу імперыі — відавочна выглядае занадта магічнай датай у яго вачах. Чаму б не паспрабаваць да гэтага часу сабраць усе рускія землі? Рэалізацыі гэтага пражэкту, на думку палітолага, і будзе падпарадкаваная дзейнасць усёй пуцінскай каманды. Як бачым, брэжнеўскім застоем тут пакуль не пахне.

ПАРТЫІ

# ПІРАТЫ ЧАЦВЁРТАГА РЭЙХУ

Алег НОВІКАЎ

**На думку шматлікіх палітолагаў, неанацызм у Германіі можа адрадзіцца пад шыльдай Партыі піратаў, якая, на першы погляд, змагаецца за правы карыстальнікаў інтэрнэту.**





19 верасня ў Берліне адбылася агульная прэс-канферэнцыя правых партый «Pro Deutschland» і «Die Freiheit» («Свабода»), прысвечаная вынікам выбараў у сталічны парламент. Гэтыя вынікі цяжка назваць прыемнымі для арганізатараў мерапрыемства. Правыя атрымалі смешныя працэнты. У сярэднім кожная з партый сабрала каля 1–2 працэнтаў. Нашмат менш для таго, каб мець у Сенаце свае дэпутацкія фракцыі. У якасці апраўдання лідары кажуць пра тое, што ва ўсім вінаватыя... «піраты». Па іх словах, патэнцыйны выбаршчык правых аддаў перавагу Партыі піратаў, якая атрымала фантастычны паказнік — амаль 9 працэнтаў.

Меркаванне пра тое, што «піраты» зводзяць у правых партый галасы, могуць падаць трызненнем. «Мы сацыяльна-ліберальная партыя», — напісана ў «пірацкім» маніфесце. Не кажучы ўжо пра тое, што «піраты» рэкламуюць сябе як партыю абаронцаў правоў карыстальнікаў інтэрнэту.

Аднак адзін з лідараў берлінскіх «піратаў» піша ў сваім Twitter-блогу пра тое, што поспех «піратаў» стане ўдарам для сіяністаў. У склад кіраўніцтва секцыі Ніжні Рэйн-Вестфалія ўваходзіць Бода Тысэн (Bodo Thiesen), які адмаўляе Халакост і рэкамендуе аднапартыйцам чытаць рэвізіянісцкую літаратуру. Іншы «пірат» заклікае ўсіх падпісаць петыцыю за вызваленне Хорста Малера, аднаго з заснавальнікаў лявацкай тэрарыстычнай арганізацыі «Фракцыя Чырвонай Арміі», які пасля выхаду з-за кратаў падаўся ў неанацысты і ў выніку атрымаў новы тэрмін. Газета нямецкіх яўрэяў «Judische Allgemaine» выказвае занепакоенасць электаральнымі поспехамі «піратаў».

Каб зразумець такі парадокс, трэба ўзгадаць вехі «пірацкай» гісторыі. «Піраты» пачыналі ў Швецыі прыблізна гадоў пяць таму як палітычны праект праціўнікаў аўтарскага права і цэнзуры ў сеціве. На той момант такія лозунгі былі блізкія хіба што нешматлікай анархісцкай моладзі. Аднак за некалькі гадоў колькасць карыстальнікаў інтэрнэту вырасла ў разы. І каб патрабаваць танны софт або вольны выхад у інтэрнэт, больш не абавязкова быць анархістам або мець радыкальныя левыя погляды. Гэта базавыя штодзённыя патрабаванні ў часы інфармацыйнай эпохі.

На такіх прымітыўных патрабаваннях і згулялі аўтары праграмы «піратаў». Як слушна адзначае газета «Freitag»: «Замест таго, каб сімуляваць палітычную кампетэнцыю, «піраты» наабяцалі простых рэчаў, якія закранулі нерв маладых выбаршчыкаў». Вольны доступ у інтэрнэт, права рабіць пірацкія копіі фільмаў, музыкі і софту, права на бясплатны праезд у транспарце — вось краевугольныя камяні «пірацкіх» кандыдатаў.

Усе гэтыя патрабаванні, па вялікаму рахунку, прысутнічаюць у праграмах шматлікіх іншых партый. Напрыклад, лібералы, якія са свістам праваліліся ў Берліне, адпаведна праграме, выступаюць за «інфармацыйнае самавызначэнне». У перакладзе на нармальную мову, гэта барацьба з той самай цэнзурай у сеціве (адна з галоўных тэмаў Партыі піратаў). Аднак паспрабуй бюргеру зразумець, што значыць тое «інфармацыйнае самавызначэнне».

Так ці інакш, сёння «піраты» ўяўляюць вялікую ідэйную салянку. Эксперты ўжо налічылі ў партыі некалькі фракцый, якія, на іх думку, позна ці рана перасвараць у барацьбе за брэнд. Гэта — левыя, якія перайшлі сюды з шэрагаў Зялёных і анархістаў, лібералы і карычневыя «піраты».

І не факт, што пераможцамі ў гэтай сутычцы будуць прадстаўнікі больш шматлікай, на першы погляд, левай фракцыі. Ужо класічным стаў анекдот пра тое як Андрэас Баум, лідар берлінскіх «піратаў», адказаў на пытанне журналістаў пра тое, што ён як новы дэпутат ведае пра пазыкі муніцыпалітэта Берліну: «Гэта шмат-шмат мільёнаў» (на самай справе, запазычанасць сталіцы калі 63 мільярдаў еўра).

Як іранізіруе нямецкае левае выданне «Jungle World», такое ўяўленне пра эканоміку гарантуе Партыі піратаў хуткую інтэграцыю ў правы або ліберальны палітычны спектр, прадстаўнікі якога кажуць нейкія абстракцыі пра стан эканомікі. Левы палітык так ці інакш ведае азы палітычнай эканомікі

Якія шансы ў карычневых перахапіць «піратаў»? Вельмі някепскія. Прынамсі таму, што літаральна на вачах Партыя піратаў стала галоўнай антыфемінісцкай партыяй Германіі. У кіраўніцтве «піратаў» фактычна няма жанчын, а самі лідары лічаць, што фемінізм, як і іншыя «ізмы», — гэта пережытак эпохі, калі чалавецтва яшчэ не ведала інтэрнэт.

Феміністкі ўжо кажуць пра перспектыву ператварэння «піратаў» у агрэсіўную мужчынскую партыю, паколькі яна ў тым ліку патрабуе неабмежаванага доступу да ўсіх парнаграфічных сайтаў. Яны нават пачалі называць «піратаў» «постпарнаграфічнай партыяй».

У сваёй крытыцы фемінізму Партыя піратаў вельмі падобная да нацыстаў, якія таксама адмаўляюць гендэрную роўнасць, аднак па прычыне таго, што гэта выдумка жыда-масонаў. Можна меркаваць, што па ходу нарастаючага цяпер канфлікту ўсё больш нацыстаў пачне сімпатызаваць «піратам», што адаб'ецца ў профілю партыі.

Між тым, пакуль феміністкі лаюцца з піратамі, сацыялагічныя агенцтва інфармуюць, што рэйтынг пірацкай партыі складае па краіне ўжо сем працэнтаў. Такая лічба гарантуе праход «піратаў» у Бундэстаг і ставіць пад сумнеў стварэнне кааліцыі сацыял-дэмакратаў і Зялёных, якой, здавалася, не пазбегнуць. Цяпер трэба браць у кампанію трэцяга — Партыю піратаў. Аднак не факт, што праз два гады, калі адбудуцца выбары ў Бундэстаг, тыя будуць называць сябе сацыял-лібераламі.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ВІКТАР ЯНУКОВІЧ



Прэзідэнт Украіны трапіў у аналы сусветнай масавай культуры, паколькі стаў героем культавага мультсерыялу «Сімпсаны». Адным з галоўных персанажаў новага эпізоду стаў нейкі напалову гангстэр, напалову ўплывовы палітык Віктар. У яго дужая постаць, твар з даволі грубымі рысамі. Сядзіць гэты Віктар у сталіцы Украіны Кіеве, дзесьці недалёка ад Майдана Незалежнасці ў велізарным кабінеце. Пра тое, што Віктар — гэта ўкраінскі гарант, кажуць шматлікія дробязі. У адным з эпізодаў Віктар вельмі цешыцца таму, што спявачка Бейонсе пагадзілася праспяваць на дні нараджэння яго дачкі. Няцяжка здагадацца, што пад выявай дачкі можа хавацца Рынат Ахметаў, а дзень нараджэння — гэта адкрыццё стадыёна «Данбас Арэна», на якой і спявала зорка ў 2009 годзе. Яшчэ адзін паказальны эпізод мульціку — гісторыя з жонкай Віктара. Яна ў кадры з'яўляецца толькі раз, але вельмі не своечасова. На што Віктар абураецца: «Я ж загадаў табе сядзець у сваім пакоі». Відавочна, нават у ЗША ўжо ўсё ведаюць гісторыю пра тое, што Януковіч забараніў жонцы Людміле з'яўляцца на публіцы.

### КРЫС КРЫСЦІ



Губернатар штату Нью-Джэрсі ад партыі рэспубліканцаў адмовіўся ад удзелу ў перадвыбарчай гонцы. Хаця яшчэ нядаўна ён лічыўся цалкам верагодным кандыдатам. Фішка ў тым, што Крысці робіць сабе імідж як палітык, які мае вялікую вагу і ганарыцца гэтым. Для яго ягоны тлушч — абарона тэзісу пра тое, што амерыканцаў, нацыю таўстуноў, павінны прадстаўляць у органах улады таўстуны. Чуткі пра магчымы паход Крысці на Белы дом выклікалі інтарэс у публікі, што само па сабе не дзіўна, паколькі дзве трэці амерыканцаў маюць праблемы з лішняй вагой. Сапраўды, шмат хто кажа, што хацеў бы мець тоўстага прэзідэнта. Хаця хапае і жартаў. Прэса піша, што ў выпадку абрання Крысці прэзідэнтам Злучаныя Штаты паспрабуюць захапіць усе сеткі фаст-фудаў. Застаецца дадаць, што Вільям Тафт, прэзідэнт ЗША пачатку XX стагоддзя, меў вагу 158 кілаграмаў.

### КІМ ЧЭН ІР

Вялікі правадыр Паўночнай Карэі вырашыў ачысціць мазгі суайчыннікаў ад непатрэбнай інфармацыі. У КНДР ідзе кампанія супраць прагляду замежнага кіно. DVD-дыскі з такімі фільмамі завозяць сюды кітайскія камерсанты. Відавочна, што змест кожнага галівудскага фільма папросту разбурае ўсе прапагандысцкія штампы. Асабліва, па словах саміх паўночных карэйцаў, іх уражваюць фільмы, зробленыя ў Паўднёвай Карэі, якая, адпаведна палітпропу, дасюль жыве ў жудаснай галечы пад ярмом амерыканскага імперыялізму. Яшчэ два гады таму ўлады КНДР пачалі кампанію супраць прагляду DVD. Яна заключалася ў тым, каб па вечарах урывацца ў дамы і правяраць, што глядзяць гаспадары. Аднак на днях прынята рашэнне надаць кампаніі новае дыханне. Цяпер аблавы на аматараў замежнага кіно праходзяць у маштабах цэлых раёнаў. Інспектары пры гэтым не толькі правяраюць фільматэку гаспадароў, аднак таксама робяць вобшук усяго дома. Ёсць першыя арыштаваныя, якім, па мясцовых законах, пагражае смяротнае пакаранне. Адзіная надзея паўночных карэйцаў на хуткую новую кампанію. На днях Кім Чэн Ір заявіў пра неабходнасць правесці крыжовы паход супраць практыкі насіць майкі.



ПАМЯЦЬ

# СЛУЦКІЯ МОГІЛКІ: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАЕ

Таццяна УЛАСЕНКА

**Набліжаецца нацыянальны дзень ушанавання памяці нашых продкаў — Дзяды. Гэта своеасаблівы дзень для кожнага з нас — калі мы наведваем могілкі, дзе спачываюць родныя і блізкія, задумваемся пра свае карані, якія моцна трымаюць нас на нашай зямлі, пра пераемнасць пакаленняў, пра спрычыненасць да агульнай гісторыі, увасобленай у кожным чалавеку, які нарадзіўся, жыў і сышоў у іншы свет, перадаўшы жыццё і хаду гісторыі сваім нашчадкам.**






Нагодай для напісання артыкула стаў непрыемны інцыдэнт падчас правядзення талакі па добраўпарадкаванню старых могілак у цэнтры Слуцка, якую зладзілі актывісты грамадскай кампаніі «Наш Дом». Акцыю, якую мусілі б падтрымаць і мясцовыя ўлады і простыя случчакі.

## У супрацьстаянні з міліцыяй

Да ініцыятараў далучылася некалькі гарадскіх жыхароў, але шчырае жаданне грамадзян прыйшлося не да спадобы мясцовым уладам. Уборка могілак нашых продкаў пераўтварылася ў супрацьстаянне з праваахоўнікамі ў цывільным, міліцыяй і ідэалагічнымі работнікамі.

Ад пачатку акцыі ўзнікла спрэчка з прадстаўнікамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якія таксама былі запрошаны на дабрачыннае мерапрыемства. Але, замест таго, каб дапамагаць, яны насміхаліся з удзельнікаў акцыі, давалі ўказанні. У планах дзяржаўных работнікаў стаяла добраўпарадкаванне бліжэйшых ад дарогі магіл, бачных гараджанам з вуліцы. Але ўдзельнікі ад пачатку вырашылі прыбраць самыя занядбаныя месцы. «Не, даражэнькія, мы прыйшлі ў першую чаргу даглядзець магілы вядомых беларусаў, а таксама магілы XIX стагоддзя, бо ўжо не засталося ў Слуцку іх сваякоў і блізкіх!» — заспрачалася з камунальнікамі ініцыятар талакі случчанка Зінаіда Цімошык. Але спрэчкай усё не скончылася. У выніку правакацыі ўладаў добраўпарадкаванне могілак магло завяршыцца трагедыяй.

Адзін з удзельнікаў акцыі, праваабаронца і былы дэпутат Вярхоўнага савета XIII склікання Валерый Шчукін ледзь не патрапіў пад скіраваны на яго трактар для вывазу смецця, якім быў раструшчаны інвентар, а адскочыўшая з-пад колаў рыддзёўка трапіла ў галаву журналістцы «Белсату», яе прыйшлося везці ў лякарню для аказання медычнай дапамогі. Сведкамі гэтых здарэнняў сталі ўсе ўдзельнікі акцыі — людзі пераважна пенсійнага ўзросту, некалькі маладых гараджан, якія, кінуўшы мяцёлкі і граблі, пачалі абараняць пацярпелых. Нехта з прысутных заўважыў: «Не хапала толькі танкаў!»

Напярэдадні талакі ініцыятары акцыі разаслалі індывідуальныя запрашэнні дваццаці чатыром дэпутатам раённага савету, якія маюць выбарчыя акругі ў Слуцку, асобна быў запрошаны старшыня раённага савета дэпутатаў В. Ф. Ржанец. Але ніводзін з іх не спрычыніўся да добрай ініцыятывы гараджан.

Актывістка Зінаіда Цімошык датэлефанавалася да аднаго з дэпутатаў — кіраўніка раённага камітэта БРСМ, каб запрасіць на добраўпарадкаванне могілак: «Вас жа абіралі людзі. Прыйдзіце, пакажыцеся ім, магчыма, атрымаеце бонусы па сваёй далейшай дэпутацкай дзейнасці. Людзі пабачаць, што вы працуеце разам з імі». Але дэпутат адказаў, што ён чалавек паднявольны і падпарадкоўваецца толькі старшыні раённага савета дэпутатаў.

Спадарыня Зінаіда, якая цягам некалькіх гадоў добраахвотна прыбірае асобныя магілы, абурэецца: «На жаль, ніякай дапамогі ад уладаў чакаць не даводзіцца. Хутка Дзяды, а могілкі, якія знаходзяцца ў дваццаці метрах ад жылых дамоў, у жудасным стане! Канешне, насельніцтва само павінна клапаціцца пра індывідуальныя магілы родных і сваякоў. Але праходы да магіл, могілкі ў цэлым, павінны ўтрымлівацца ў ідэальным становішчы мясцовымі ЖКГ! На гэта спецыяльна выдзяляюцца сродкі. Кантроль за добраўпарадкаваннем пахаванняў на тэрыторыі кожнага раёна ажыццяўляе мясцовая ўлада, а таксама дэпутацкі корпус».

І сапраўды, вялізныя могілкі, дзе пахаваны вядомыя нашы землякі, знаходзяцца ў такім занядбаным стане, што да некаторых магіл немагчыма патрапіць без сякеры, прасякаючы сабе сцяжынку праз хмызняк. Практычна па ўсёй тэрыторыі могілак рассыпана смецце, пластыкавыя бутэлькі з-пад піва, аднаразовы посуд, шкляныя бутэлькі з-пад гарэлкі; шматлікія магілы буйна параслі чартапалохам, дзе-нідзе трапляюцца вялікія сметнікі; спілаваныя магутныя дрэвы спачываюць на магілах XIX стагоддзя.

## Старадаўні Некрополь

Могілкі, гісторыя якіх пачынаецца ў XVII стагоддзі, знаходзяцца ў цэнтры горада па вуліцы 14 Партызан і займаюць да 6 гектараў зямлі. Гэта сапраўдны некропаль Слуцка, які захоўвае ў сабе гісторыю чатырох стагоддзяў! Тэрыторыя могілак умоўна падзелена на чатыры часткі — з праваслаўнымі пахаваннямі, каталіцкімі, яўрэйскімі і самымі занядбанымі — лютэранскімі. Да гэтага часу на частцы лютэранскіх пахаванняў захаваліся магілы часоў Вялікага Княства Літоўскага. Да случкіх могілак прылягае і вялізны мемарыяльны комплекс у памяць загінулых салдат Другой сусветнай вайны. Тут парадак.

На могілках пахаваны героі паўстання Кастуся Каліноўскага, слуцкія паўстанцы, святары, дырэктары школ, кіраўнікі раёну, простыя людзі, ёсць брацкія магілы. Тут знайшлі вечны спачын вядомыя культурныя дзеячы Беларусі: да іх магілаў прыходзяць не толькі землякі, але прыязджаюць і людзі з замежжа. Так, пісьменнікі з Польшчы, Украіны прыязджаюць пакланіцца магіле паэта-дэмакрата XIX стагоддзя, удзельніка паўстання К. Каліноўскага Альгерда Абуховіча, творы якога дайшлі да нашых часоў.

## Варварскае стаўленне да гісторыі

Вялікую гістарычную каштоўнасць прадстаўляе марморовы помнік Люцыне Ордзе з роду Руткоўскіх — нявестцы вядомага беларускага мастака і кампазітара Напалеона Орды. Яе магілу разрабавалі пасля Другой сусветнай вайны, а надмагільную пліту спрабавалі вывезці — ды не атрымалася. Так пліта і засталася ляжаць, расколатая на дзве часткі. Зараз гэта ўлюбёнае месца п'янтосаў, якія, карыстаючыся адсутнасцю аховы, надмагілле Люцыны Орды выкарыстоўваюць у якасці стала. Некаторыя выпівохі так наўпрост і дамаўляюцца на вечаровую сустрэчу: «Сустрэнемся ў бары «Ля графіні». Мясцовыя жыхары ведаюць, дзе знаходзіцца той «бар», праз дарогу ад якога размешчаны харчовая крама.

Блукаючы па могілках, я пабачыла адчыненыя і разрабаваныя шукальнікамі скарбаў найпрыгажэйшыя марморовыя магілы, спілаваныя часткі металічных крыжоў, парослыя імхом пліты XVIII стагоддзя. Некаторыя помнікі ўразілі сваімі формамі і шыкоўнымі вобразамі — з увасобленай прыродай, дрэвамі і кветкамі, іншыя, высечаныя з валуноў, нагадалі старадаўніх ідалаў. Усе гэтыя гістарычныя каштоўнасці, творы мастацтва, на жаль, не ахоўваюцца службамі гораду.

«Як будзе выхавана наша моладзь, калі сярод могілак п'юць, гуляюць, брыдкасловяць?! — разважае ініцыятар кампаніі па добраўпарадкаванню могілак Зінаіда Цімошык. — Я пабывала ў Германіі, Аўстраліі, іншых краінах свету і пабачыла, як прыстойна там выглядаюць месцы пахаванняў, як ушаноўваюць людзі памяць продкаў. Мне захацелася, каб нашы грамадзяне мелі такі ж годны апошні прытулак. Мая мара — добраўпарадкаваць занядбаныя могілкі па ўсёй Беларусі». Сваёй апантанай дзейнасцю спадарыня Зінаіда абапіраецца на Пастанову Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2002 года №17/43 пра ўтрыманне месцаў пахавання памерлых, у якой прапісаны нормы па ўтрыманні могілак.

«Законы павінны выконвацца! — кажа яна. — Гэта значыць, могілкі павінны мець прыстойную агароджу, цэнтральны ўваход, праходы да магіл павінны захоўвацца ў ідэальным стане, кантэйнеры для смецця не павінны перапаўняцца. Мусіць быць установа для выдачы інвентару: асабліва гэта важна для горада, бо некаторыя людзі пражываюць у аднапакаёвых кватэрах, не маючы магчымасці размясціць інвентар. У наяўнасці павінна быць кніга ўліку са змешчанай інфармацыяй па кожнай асобнай пранумараванай магіле, хто за ёй даглядае, кантакты гэтага чалавека. Згодна з Законам, выканаўчыя органы ўлады здзяйсняюць кантроль, каб магілы не прарасталі быллём. Існуе Адміністрацыйны кодэкс, згодна з якім не дазваляецца вырошчваць на магілах двухметровае кустоўе. І калі чалавек не даглядае магілу, то павінен панесці адміністрацыйную адказнасць».

Случчанка тры гады таму пачала перапіску аб дапамозе ў добраўпарадкаванні могілак з мясцовым райвыканкамам, звярталася ў суд; актывісты «Нашага Дому» абыходзілі гараджан з інфармацыйнымі матэрыяламі, збіралі подпісы. «Адзінае, чаго я патрабую, — каб выконваўся Закон аб пахаваннях, які пакуль не дзейнічае ў Слуцку. Улады не павінны дэманстраваць сваё варварскае стаўленне да гісторыі, падаваць прыклады пасіўнасці да грамадскіх дабрачынных ініцыятыў. Тая ідэалогія, якую сёння прапагандуюць сваім стаўленнем да праблемаў горада так званыя «народныя абраннікі» — праз свае паводзіны, учынкі, — гэта ідэалогія бездухоўнасці, забыцця памяці памерлых. Прыборка могілак прайшла б нашмат прадуктыўней, калі б мясцовыя міліцыянты не запалохалі сваёй прысутнасцю і правакацыямі гараджан».



Зінаіда Цімошык і Валеры Шчукін у вострай размове з прадстаўнікамі ўладаў

КІНО

# ПРЫГОДЫ ПОСТМАДЭРНІЗМУ

Андрэй РАСІНСКІ

**У 2009 годзе без абвяшчэння дыягназу памёр постмадэрнізм. Ягоны сыход знаменавалі дзве падзеі. Прэзідэнтам Злучаных Штатаў упершыню быў абраны цемнаскуры амерыканец. Барак Хусейн Абама прыступіў да выканання сваіх абавязкаў 20 студзеня. Другі істотны для гэтай гісторыі цемнаскуры, якога часам называлі ўзорам постмадэрнізму — Майкл Джэксан, — пакінуў гэты свет праз паўгода.**





Майкл Джэксан у постмадэрновым кліпе «Трылер»



« Крымінальнае чытво» — ключавы постмадэрновы фільм

## Развітанне з эпохай

У футурыстычным «Пятым элеменце» Люка Бесона, зробленым у папулярным для 1997 года эклектычна-постмадэрновым стылі, цемнаскуры прэзідэнт з'яўляўся толькі ў XXIII стагоддзі. Але гісторыя ўвасобілася з апярэджаннем. Паказальна, што за амерыканскі сталец змагалася і жанчына (у серыяле «Рабакоп» — таксама далёкая будучыня); вылучэнне на першы план групаў, якія знаходзіліся на перыферыі, — паказальная рыса постмадэрнізму.

У сваю чаргу, поп-ідал Майкл Джэксан зрабіў вялікі ўнёсак у постмадэрнізм. Ягоны кліп «Трымценнік», дзе герой пераўтвараецца ў ваўкалака і танчыць з мерцвякамі, — узорны постмадэрновы твор, дзе сплятаюцца інтэлектуальная іронія і масавыя пацешкі.

Але Джэксан спрычыніўся да постмадэрнізму не толькі творчасцю. Ягоная асветленая скура і шматлікія аперацыі зажыва дэманстравалі тыповую для стылю тактыку «палімпсесту», «цытатаў» і «аўтарскай маскі».

Нядаўна гэтую маску пахавалі.

## «Плэйбой», Караткевіч, Умберта Эка і Лукашэнка

Але паглядзім, як усё пачыналася. Сам тэрмін «постмадэрнізм» з'явіўся ў 1914 годзе, у 1947 годзе Арнольд Тойнбі ў кнізе «Разуменне гісторыі» скарыстаў яго як сімвал сыходу Захаду. Але маніфестам постмадэрнізму стаўся артыкул Леслі Фідлера «Перакрочвайце межы, засыпайце ірвы», надрукаваны ў 1969 годзе.

Фідлер заклікаў скасаваць падзелы паміж элітарным і масавым, зруйнаваць іерархіі, змяшаць другаснае і каштоўнае — і прадэманстраваў гэта ўласным прыкладам: філалагічны артыкул быў надрукаваны ў часопісе «Плэйбой», у якога, мякка кажучы, крыху іншыя прыярытэты.

Наступіла, па словах філосафа Ліатара, «эпоха постмадэрну». У Францыі віравала студэнцкая і сэксуальная рэвалюцыя, калі элітарны рэжысёр Гадар распаўсюджваў маоісцкія ўлёткі для масаў, а юнакі, натхнёныя інтэлектуальным сінематографам, ладзілі любоў на траіх («Летуценнікі» Берталучы). У Злучаных Штатах ішлі вулічныя баі паміж геямі і паліцыяй (так званае Стоўнволскае паўстанне), а дэканструктар «фалалогацэнтрызму» Жак Дэрыда ўголас радаваўся: «Структуры на вуліцы не выходзяць».

Еўрапейская культура абвяшчалася ледзьве не суцэльна каланіяльнаю; колішнія гісторыі ператалумачваліся, каб знайсці там дзіркі, прагалы і суцэльную хлусню; наступала паліткарэктнасць.

У мастацтве постмадэрнізм цешыў кактэйлем касмічнай оперы, вестэрнаў і фантазій у «Зорных войнах», забаўляў прыгодамі манахаў у «Імені ружы» і радаваў нечаканымі цытатамі і спасылкамі: «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Уладзіміра Караткевіча — постмадэрновы твор.

Умберта Эка, аўтар «Імені ружы» — сур'ёзны навуковец, які піша масавыя гісторыі з інтэлектуальнай падкладкай, — разглядаў постмадэрнізм як змену адной эпохі другой. Калісьці быў мадэрнізм — з «Чорнымі квадратамі» Малевіча, Вялікімі Гісторыямі і аўтарамі-дэміургамі. Цяпер — постмадэрнізм, калі (скарыстаем словы беларускага аўтара) «здрабнелі нават блазны».

Постмадэрнізм — крызісны пераход. Калісьці такім быў маньерызм — у мастацтве, скептыцызм і кінізм — у філасофіі. Але, у адрозненні ад папярэдніх часоў, сённяшні культурніцкі крызіс суправаджаецца спажывецкай асалодай.

Але здараюцца і недарэчнасці. Так, Беларусі ў гэтым сэнсе пашанцавала.

Рэжым, які ўсталяваўся ў краіне, — гэта першая (і, спадзяюся, апошняя) постмадэрнісцкая дыктатура ў свеце, які імкліва старэе. Як і ў постмадэрнізму, гэта практыка сэканд-хэнду: няма нічога свайго, усё ўжо зроблена і застаецца толькі красці. Крадзецца савецкая спадчына, расійская папса, заходні імпарт тавараў, а паверх ляпяюцца свае цэтлікі.

Крызіс калгасна-трэшавай беларускай мадэлі, пакінутай без грошай, супаў з крызісам постмадэрнізму. Сусветныя фінансавыя закалоты, тэрарыстычныя атакі, пад'ём ісламу — яшчэ і пазнака агульнага надлому. Схавацца нікому не атрымаецца.

Але напаследак можна паглядзець на творы аднаго постмадэрновага аўтара, прадстаўленага на беларускіх экранах.

## Павучальныя прыгоды Педра Альмадовара

Напрыканцы 1970-х гадоў у кінематограф лёгкай хадой на высокіх абцасах уварваўся Педра Альмадовар. Гэта быў час — пасля смерці генерала Франка, — калі Іспанія радавалася вольніцы, як падлетак, якому суворыя бацькі доўга забаранялі піць, паліць і трахаць усё, што шавеліцца.

Сам Альмадовар пачынаў у клубах з адмысловай рэпутацыяй; героямі ягоных стужак былі німфаманкі і геі, сакрэтныя іранскія агенты і транссэксуалы, шальныя цётухны з пісталетамі і сэксуальныя маньякі-ўцекачы. «Дзве шлюндры» сведчылі пра «гісторыю любові, якая завяршаецца вяселлем» (1974 год), «Пэпі, Люсі, Бом і астатнія дзяўчынкі» блукалі ў «Лабірынце жарсцяў», а рэжысёр працягваў заклікаць: «Трахні мяне, трахні мяне, трахні мяне Цім!» (назва стужкі 1978 года).

Альмадовар стаўся ключавою фігурай постмадэрнізму, які ў тыя часы трыумфаваў (на падыходзе быў яшчэ Таранціна з «Крымінальным чытвом»). Колеры ў фільмах Альмадовара яскравыя, вульгарна-перанасычаныя, каб у вочы ўплішчваліся, сюжэты скандальныя, іранічна-бульварныя. Масавасць — з замаскаванай тонкай іроніяй — асноўная рыса постмадэрнізму.

Але просценькія гісторыі напісаныя па запаветах Фідлера — паверх інтэлектуальных твораў: гароты кінутай палюбоўніцы з «Жанчынай на мяжы нервовага зрыву» паўтаралі енкі з нуднаватай п'есы Както; «Кіка» з маньякамі, порназоркамі і лесбіянкамі ішла за «Фотапавелічэннем» Антаніёні, а меладраматычна-крымінальны «Матадор» цытаваў філасофска-эратычную «Карыду кахання». Мяшалася ўсё — ад рэкламы кандомаў да фрызуры пад Медузу Гаргону.

І, нарэшце, галоўнае — Вялікія Гісторыі адмяняліся. Што развагі пра «пральны парашок для Джоні-забойцы», што касцельныя правілы — на адным узроўні. Цэнтру няма, паўсюль маргіналіі.

Але постмадэрновы хаос — 20 гадоў таму — яшчэ выглядаў жывым і імпэтным.

Пакрысе Альмадовар сцішыў радасна-хуліганскія выпады дый заглыбіўся ў псіхалогію герояў, зрабіўшы на мяжы 2000-х, бадай, найлепшыя свае стужкі: «Усё пра маю маці» і «Паразмаўляй з ёй». Карціны, дзе пры ўсёй скандальнасці гучалі шчырыя словы спачування і мацярынскай любові, абяцалі новы этап у рэжысёрскае творчасці.

Але Альмадовар паспрабаваў вярнуцца да гулліва-постмадэрновай эклектыкі. Карціна «Скура, у якой я жыву», што цяпер ідзе ў мінскіх кінатэатрах, распавядае пра доктара, які праводзіць забароненыя генетычныя эксперыменты з чалавечай скурай дый трымае дома таямнічую пацыентку. Гэта сітуацыя нізавых хорараў, у якіх асабліва адзначыўся суайчыннік Альмадовара Хесус Франка.

Але, у адрозненні ад бадзёрага Хесуса Франка, які ніколі не вылазіў з падполля, карціна Альмадовара разлічана на Канскія фэсты з чырвонымі дарожкамі (дзе яна і была) і высокую публіку, якая чакае ад мэтра прыгажосці.

І гэтыя «прыгажосці» ў фільме з'яўляюцца: аголенае жаночае цела Алены Анайі, якое паўтарае абрысы класічных карцінаў, паразвешаных у доме хірурга; вытанчаныя касцюмы цяляснага і чорнага колеру, дым з опіумам — амаль тактыльнае пачуццё.

Харызматычная актрыса Марыса Парэдэс апранутая ва ўрачыстую форму. Нават прыдуркаваты злачынец, які ўцёк з маскараду ў касцюме тыгра, выглядае фігурай на свецкім раўце.

І хаця сюжэтных наваротаў хопіць на дзесяць ранніх альмадовараўскіх карцінаў, яны не вельмі кранаюць. Антоніа Бандэрас, калісьці адкрыты Альмадоварам дый запрошаны на ролю хірурга, выглядае не столькі жывым чалавекам, колькі ганароваю статуяй.

І гэта — не рэжысёрскія памылкі, а дакладны адбітак часу: постмадэрнізм завяршаецца.

Тое, што калісьці было пратэстам, — сёння істэблішмент, халодны, натужлівы і запакаваны ўладным кічам пад самае горла. Позірк гламурнага лекара: пластычныя аперацыі, змена полу, штучная скура, любая прыхамаць для вашых і ягоных пажадаў — чаго яшчэ вам захочацца?

Геі і лесбіянкі — сёння легалізаваныя (некаторыя на пасадзе міністраў); у Злучаных Штатах прэзідэнт — цемнаскуры.

Гісторыя — насуперак фукуямаўскім сцверджанням постмадэрністаў — яшчэ не завяршылася. Новыя гісторыі не тасуюцца, а ствараюцца на нашых вачах — але з канскіх палацаў гэта не бачна.

А колішні герой сэксуальнага андэграўнду, Педра Альмадовар, прыўлашчаны і запрошаны на самы верх, зусім не стаміўся.

Стаміўся сусветны постмадэрнізм. Пачынаецца нешта новае.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# «ІНТЫМНАЯ» ВЕЧАРЫНА ЛЯВОНА ВОЛЬСКАГА

Мікіта БРОЎКА

**3 кастрычніка ў клубе «Графіці» адбыўся адзін з двух запланаваных «інтымных» канцэртаў вядомага беларускага музыкі Лявона Вольскага, які зусім нядаўна выдаў сваю першую кнігу прозы. Такім чынам, канцэрт уключыў у сябе і афіцыйную прэзентацыю празаічнага зборніка «Міларусь».**

Яшчэ ў самым пачатку вечара амаль усе месцы за столікамі ў невялічкім «Графіці» былі занятыя, але стоячых гледачоў было няшмат — усё ж такі кошт квітка спалохаў шмат патэнцыяльных наведнікаў. Але і тых, хто не пашкадаваў ста тысяч на квіток, было нямала. Пачатак імпрэзы быў запланаваны на 19 гадзін, але сам Лявон Вольскі выступаць не спяшаўся — канцэрт пачаўся з гадзінным спазненнем. Планавалася, што Лявону будуць дапамагаць гітарыст Павал Траццяк і басіст Алесь-Францішак Мышкевіч, але апошні з-за хваробы не змог прыняць удзел у выступе. Такім чынам, з-за сумных абставін трыа Вольскага пераўтварылася ў дуэт, што, безумоўна, паўплывала на гук не ў лепшы бок — басу ўсё ж не хапала.

Выступ пачаўся песнямі з «Белай яблыні грому» — першай была выканана «Пахне чабор» на верш Петруся Броўкі, а наступную песню, «Мала сказаць: ненавіджу» на верш Пімена Панчанкі, Лявон Вольскі прысвяціў Алесю Бяляцкаму. Лявон Вольскі адразу прапанаваў гледачам



Вераніка Круглова ў дуэце з Лявонам Вольскім

перадаваць яму любыя, нават самыя правакацыйныя пытанні. Публіка актыўна адгукнулася на прапанову і пачала з энтузіязмам крэмзаць пытанні на сурвэтках. Зусім хутка каля сцэны з'явіўся цэлы стос цыдулак.



скага Ганна, у якой жартаўліва намагаўся адабраць фотакамеру фатограф «Будзьма!» Аляксандр Ждановіч.

Пазней акрамя твораў з «Народнага альбому» былі і гіты «Крамбамбулі», а бліжэй да

**Лявон Вольскі выступіў з праграмай, якая не мае аналагаў, — больш нідзе вы не пачуеце настолькі шырокай панарамы культавых беларускіх спеваў**

Затым пайшлі песні з «Народнага альбому». І тут нечакана ўзнік імправізаваны дуэт — падчас выканання «Простых словаў» да Лявона Вольскага нечакана далучылася вядомая спявачка Вераніка Круглова, вакалістка гурта «KRIWI». За ўсім гэтым усмешліва назірала жонка Воль-

канца загучалі песні «N.R.M.». Асабіста ў мяне выкананне «энэрэмаўскіх» песень выклікала супярэчлівыя пачуцці — здаецца, вось яны, улюбёныя песні дзяцінства, але тое, калі фірмовыя сола Піта Паўлава выконвае іншы чалавек, пакідае пачуццё нейкага блюзнерства. Пачынаеш адчуваць, што тая старая легенда ўжо памерла, што той непадзельны звяз чатырох чалавек, што стварылі легенду беларускага року, ужо не вернецца.

Акцэнтую ўвагу: Лявон Вольскі выступіў з праграмай, якая не мае аналагаў, — больш нідзе вы не пачуеце настолькі шырокай панарамы культавых беларускіх спеваў — старыя знакавыя песні «Мроі», легендарныя гіты «N.R.M.», вясёлая «Крамбамбуля» з «Саўкам ды Грышкам», сур'ёзная «Белая яблыня грому» і культавы «Народны Альбом». А калі ўлічыць той факт, што «Мроі» даўно не існуе, а «N.R.M.» з «Крамбамбуляй» — пад забаронай, канцэрты Вольскага застаюцца адзінай магчымасцю пачуць іх спевы жыўцом.

Дуэту Лявона Вольскага некалькі разоў даводзілася выходзіць на біс. Апошні раз частка гледачоў ужо было паверыла, што прагучала апошняя песня, і сышла, але самыя адданыя фанаты зноў дамагліся выхаду на сцэну музыкаў, якія на развітанне выканалі «Абсэнт». На гэтым канцэртная частка вечара скончылася.

Пасля невялікага перапынку Лявон Вольскі падпісаў усім ахвочым сваю новую кнігу «Міларусь». Чарга за аўтографамі расцягнулася на ўвесь клуб, у якім паступова аднаўлялася звычайная вечаровая атмасфера, аднак пранізаная духам рамантыкі і пазітыву, што пакінуў выдатны музыка Лявон Вольскі.

ВАНДРОЎКА

# «У ПОШУКАХ ІДЫШУ»

## СМІЛАВІЧЫ—БАБРУЙСК—ПАРЫЧЫ

**Вандроўка па слядах амаль зніклай цывілізацыі — культуры беларускіх габрэяў, роднай мовай якіх стагоддзямі быў ідыш.**

Гэтым разам рушым на ўсход разам з Алесем Астравухам — мастаком-рэстаўратарам, аўтарам ідыш-беларускага слоўніка і знаўцам габрэйскай культуры.

Наведаем роднае мястэчка славутага мастака габрэйска-беларуска-французскай школы (сябра Амадэа Мадыльяні і Пабла Пікасо) Хаіма Суціна Смілавічы і прысвечаны яму незвычайны музей.

Пачуем «легенды Інваліднай вуліцы» ў «цудоўным, высокакультурным месцы» Бабруйску.

Пазнаёмімся з маленькай, але бязмежна гасціннай габрэйскай абшчынай мястэчка Парычы на рацэ Бярэзіне.

Адзначым цудоўнае габрэйскае свята Суккот у коле сапраўдных бабруйчан!

Пазнаёмімся з незвычайнай і каларытнай мовай ідыш.

У выкананні Алеся Астравуха і Аляксея Жбанава пачуем прыгожыя песні на гэтай мове.

Будзе магчымасць спяваць разам!

Пакаштуем традыцыйныя стравы габрэйскай кухні.

Паўдзельнічаем у творчых спаборніцтвах з каштоўнымі прызамі.

ВАНДРУЙМА РАЗАМ!
Zol es zayn eykh voyl bakumen!

Кошт вандроўкі — 125 тыс.:
транспарт (каля 500 км);
музей-кавярня Хаіма Суціна ў Смілавічах;
экскурсіі па Смілавічах, Бабруйску, Парычах;
гарбата-кава;
пачастунак;
канцэрт.

Даведкі па тэлефоне
+375 29 1802838 (Святлана)

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ЯНЫ ВАС ЧАКАЮЦЬ!

### Чара — пяшчотная і паслухмяная маладая мамачка



Чара трапіла ў адлоў цяжарнай. Шасцёра шчанюкоў работнікі Гурскага паспелі ўсыпіць. І ў гэты момант на «Фауну горада» прыйшла Аня, дзяўчына-валанцёр, якая ледзь паспела выратаваць Чару і двух яе дзетак, забрала дахаты, а зараз шукае добрых і адказных гаспадароў гэтаму малому цуду.

Чары недзе год, ростам каля 40 см. Яна прызвычаеная да выгулу, добра ладзіць з іншымі жывёламі. Прыязная да дзяцей. Мілая, спакойная дзяўчынка. Пасля нараджэння дзетак яна вельмі аслабла, але ў хуткім часе зноў стане прыгожым, калматым сабакам.

Чара падорыць вашаму дому радасць і ўтульнасць! Тэлефануйце, выратуйце хаця б адно жыццё!

8029 696 73 93 Аня

### Бусінка — гадавалая выкшталцоная котка

Бусінка — вельмі акуратная, ласкавая, спакойная, сціплая. Цудоўна ходзіць у латочак, ладзіць з іншымі коцікамі. Перад яе кранальным позіркам проста немагчыма ўстаяць!

Бусінка стане талісманам вашага дому.



Тэлефануйце, і вы ніколі не будзеце сумаваць!

8029 650 97 29 Аксана; 8 029 779 52 03, 8029 373 96 49 Вольга

***

Усе пітомцы — у падарунак.

Болей котак і сабак — у каталогах на www.forum.superkot.com

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1038

Падпісана да друку 07.10.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.